Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. гнсцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нанпарэлі насярод тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Зьыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 85 (2273) Аўторак, 10-га красавіка 1928 г.

Ураджайнасьць лёну і кантрактацыя.

Прамысловасьць і патрэбы экспорту вымагаюць усё большай і большай колькасьці ільну-валакна. Зьбіраемая колькасьць лёну за апошнія гады не здавальняе ўзрастаючай патрэбы.

Вялікая ўвага, якая надаецца пытаньням лёнаводзтву, і прадастаўленыя па сельска-гаспадарчаму падатку ільготы засяваючым лён у выніку пашырэньне пасеўных плошчаў пад лён. Аднак, пашырэньне пасеўных плошчаў без адначасовага павышэньня ўраджайнасьці—не вырашае праблемы з лёнам.

За апошнія гады ўраджай лёну дае ня больш 60 проц. даваеннага ўзроўню. Калі да вайны валавы ўраджай лёну складаў у сярэднім 21-24 пуды з дзесяціны, дык у сучасны момант дзесяціна дае ў сярэднім па БССР ня болхш 10-11 пуд. трапанага лёну і яшчэ каля 3 пудоў адкідаў і кудзелі. Сярэдні ўраджай лёну ў Даніі дае 50 і больш пудоў з дзесяціны.

Гэтыя лічбы досыць пераканаўча гавораць аб тым, што галоўная наша бяда ў галіне лёнаводзтва ў вельмі нізкай ураджайнасьці, якая ня толькі памяншае таварны выхад валакна, але яно яшчэ зьяўляецца мала-рэнтабельным для сельскай гаспадаркі, што можа пацягнуць за сабой скарачэньне засеву ільну.

Паніжэньне ўраджайнасьці зьявілася ў выніку шэрагу прычын, як-та: выраджэньне пасеўнага матар'ялу, надмернае выкарыстаньне і дрэнная апрацоўка глебы і шэраг іншых.

Праца савецкіх органаў і каапэрацыі павінна быць у асноўным згрупавана ў правядзеньні такіх мерапрыёмстваў, якія далі-б павышэньне ўраджайнасьці.

Кожны добра ведае, што селянін не праводзіць карэннага паляпшаньня ў гаспадарцы, чакаючы земляўпарадкаваньня. Толькі пасьля правядзеньня земляўпарадкаваньня можна будзе дасягнуць з боку сялянства больш шпаркага паляпшаньня апрацоўкі і ўгнаеньня глебы, а таму неабходна дамагчыся прагрэсыўнага правядзеньня земляўпарадкаваньня ў лёнаводных раёнах. Пастанова Эканомнарады аб сканчэньні земляўпарадкаваньня ў працягу аднаго году ў прамыслова-лёнаводных раёнах павінна быць абавязкова выканана.

Перш усяго трэба дасягнуць таго, каб кантракцыя мела ня звычайны камэрцыйны характар, як гэта яшчэ ў даваенны час практыкавалася прыватнымі гандлярамі (купля лёну на корані), а каб яна была вытворчай.

Гэта значыцца, што мы не абмяжоўваемся толькі патрабаваньнем—здаць абумоўленую ў дагаворы колькасьць лёну, а па дагавору яшчэ патрабуем ад сялян правядзеньня шэрагу агрыкультурных мерапрыёмстваў па ўзьняцьцю ўраджайнасьці.

Патрабаваньні гэтыя наступнага характару: папершае, каб селянін набыў і пасеяў чыстагатунковае насеньне лёну-даўгунца, якое прывозіць каапэрацыя, ці мясцовае адборнае і апрабіраванае, падругое, каб селянін лепш угнойваў зямлю, патрэцяе, каб зьбіраў лён пасьля таго, як ён зусім дасьпее і праводзіў шэраг іншых агрыкультурных мерапрыёмстваў.

Адным словам, трэба дасягнуць таго, каб кантракцыя з году ў год уводзіла ў пэўную логву вытворчыя працэсы сельскай гаспадаркі, спрыяючыя ўзьняцьцю ўраджайнасьці. Вынікі ад усіх гэтых мерапрыёмстваў могуць быць дасягнуты пры тэй умове, калі сельска-гаспадарчая каапэрацыя і земорганы будуць сыстэматычна праводзіць агрыкультурную працу сярод гаспадарак, закантрактаваўшых свае пасевы.

Кантракцыя мінулага году правалілася. Аб гэтым зараз можна ўжо станоўча заявіць. Дагаворная кампанія так дрэнна была праведзена, што ня толькі лён слаба пастукіў па кантрактацыі, але нават грошы ня поўнасьцю зьвернуты. Сельска-гаспадарчыя каапэратывы, выдаўшы авансы пад будучы лён, больш не клапаціліся аб гэтым аж да тэрміну здачы лёну. Нават ня цікавіліся тым—ці былі наогул выдадзеныя грошы скарыстаны па прызначэньню.

Няўдалы вопыт мінулагодняй кантракцыі павінен нас навучыць, каб у другі раз не паўтарыць ужо зробленыя памылкі.

Што-ж мы маем сёлета ў гэтай галіне.

Умовы для кантракцыі лёну сёлета бязумоўна лепшыя. Усе лёнаводныя райёны дастаткова насычаны хлебам. Грошы для выдачы авансаў маюцца. Насеньне і ўгнаеньне ў большай частцы ўжо атрымана на мясцох. Ва ўсёй працы ёсьць больш плянавасьці і падрыхтаванасьці.

Аднак, зусім пельга сказаць, што ўсё добра. Дэфэктаў яшчэ маецца шмат. Напрыклад: яшчэ да 2-га красавіка Віцебскі сельсаюз не адаслаў нізоўцы блянкаў тыпавых дагавораў, а Віцебскі сельбанк да 2-га красавіка толькі аднаму таварыству перавёў грошы на кантрактацыю. У Полацку адзяленьне Цэнтраземскладу, атрымаўшы насеньне лёну, не адаслала яго ў нізоўку, чакаючы пейкага «асобнага распараджэньня» ад свайго цэнтру. Цяпер наступіла бездарожжа, якое, бязумоўна, зробіць больш дарагім перавоз насеньня ў нізавыя каапэратывы.

Нізавыя сельска-гаспадарчыя т-вы ў шмат якіх выпадках не правялі належнай падрыхтоўчай працы сярод сялянства. Напрыклад, Веткінскае сельска-гаспадарчае т-ва (Гомельскай акругі) у канцы сакавіка яшчэ ня ведала ў якіх сельсаветах і вёсках будуць праводзіць кантрактацыю. Ня ўсюды выяўлены „гнёзды“ будучай кантрактацыі. Насяленьне належным чынам не падрыхтована. Сталага практычнага плану агрэгацыйных мерапрыёмстваў па ўзьняцьцю ўраджайнасьці лёну, як у т-вах, так і ў райённага агранома яшчэ ня было.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што ня ўсё яшчэ ў поўным парадку, а між тым, гэтыя на першы погляд нібы другаразрадныя дробязі, могуць значна перашкодзіць кампаніі па кантрактацыі, калі яны ня будуць своячасова зьнішчаны.

У часе правядзеньня кантрактацыі павінен быць асабліва ўважлівы падыход да падбору гаспадарак, як з клясавага, так і з дзелавога боку.

З аднаго боку неабходна ўлічыць тое, каб кантрактацыя пайшла па лініі асноўнай серадняцкай і бядняцкай масы сялянства, а з другога боку, трэба сачыць за тым, каб не паўтараліся памылкі мінулых гадоў, калі выдадзеныя грошы былі скарыстаны не па вызначэньні.

Неабходна мець на ўвазе, што ў савецкіх умовах сыстэма кантрактацыі зьяўляецца аднэй з лепшых форм як па павялічэньню ўраджайнасьці і таварнасьці, так і наогул плянавай сувязі паміж дзяржаўнай прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай.

ХУ зьезд партыі адзначыў вялізарную ролю кантрактацыі, як сродак сапраўднага каапэраваньня сялянскай вытворчасьці праз каапэрацыю, які зьвязваецца з сацыялістычнай прамысловасьцю. Таму неабходна на гэтую справу зьвярнуць асаблівую ўвагу, каб забясьпечыць поўны посьпех.

АДАМАЙЦІС.

А. А. БАГДАНАЎ.

МАСКВА. 7 красавіка памёр дырэктар Дзяржаўнага Інстытуту пераліваньня крыві А. А. Багданаў, выдатны філёзоф, аўтар вядомага падручніка палітэканоміі, адзін з кіраўнікоў бальшавіцкае фракцыі РСДРП у пэрыяд 1904-1907 г. г.

Сьмерць выклікана тым, што арганізм Багданава атручан быў у выніку распаду чырвоных шарыкаў.

Пры Камуністычнай Акадэміі створана камісія па арганізацыі пахаваньня.

Ад чаго памёр т. Багданаў.

МАСКВА. А. А. Багданаў (Маліноўскі) памёр пасьля цяжкае хваробы ў выніку адважнага і самаахвярнага экспэрымэнту па пераліваньні крыві. Да Багданава, які зьяўляўся дырэктарам інстытуту пераліваньня крыві НК Аховы Здароўя РСФСР, зьвярнуліся два студэнты, абодвы з зародкамі сухот, прычым у аднаго з іх у мінулым была малярыя; студэнты прасілі Багданава зрабіць ім узаемна абменнае пераліваньне. Багданаў адхіліў гэтую апэрацыю, бо кроў малярыка не зьяўляецца поўнакаштоўнаю крывёю і пры вядомых умовах можа стаць нават неб сьпечнаю; як вядома, малярыйныя бацылы нішчаць чырвоныя крывяныя шарыкі.

Аднак, для экспэрымэнту Багданаў, каб паспрабаваць на сабе чыннасьць крыві малярыка, замяніў сабою аднаго з студэнтаў. Ён даў малярыку сваю здаровую кроў, каб перадаць яму зваю няўспрымальнасьць да сухот, а сам атрымаў ад яго хворую кроў. Рызыку гэтага пераліваньня ён добра ведаў, і ён утаіў свой намер ад жонкі і ад адказных працаўнікоў інстытуту. Надзею на добрыя вынікі ў ім падтрымлівала практыка ранейшых пераліваньняў крыві, але ў невялікіх дозах. Гэтая надзея ня спраўдзілася. Пералітая ў арганізм Багданава кроў малярыка на гэты раз у значна большай колькасьці, чым пры ранейшых вопытах, выклікала вострае атручаньне ўсяго цела, цяжкае занядужаньне печані і почак і ў выніку сьмерць.

ЛАЦІНА-АМЭРЫКАНСКАЯ ПРАФКАНФЭРЭНЦЫЯ.

МАСКВА, 7-4. 7 красавіка пачаліся пасяджэньні лаціна-амэрыканскае прафсаюзнае канфэрэнцыі, у якой бяруць удзел прадстаўнікі прафсаюзаў Цэнтральнае і Паўднёвае Амэрыкі, працаўнікі рэвалюцыйнага прафруху Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, Філіпін, Партугаліі, Інданэзіі, Францыі, Італіі і г. д., а таксама прадстаўнікі выканаўчага бюро Прафінтэрну.

Адыход выдатных трацкістаў ад апазіцыі.

Т. т. АНТОНАЎ-АЎСЕЕНКА І КРЭСЬЦІНСКІ ПАРЫВАЮЦЬ УСЯКУЮ СУВЯЗЬ З ТРАЦКІЗМАМ.

МАСКВА. Нядаўна атрыманы ліст тав. Антонава-Аўсеенка на імя т. Сталіна і ліст тав. Крэсьцінскага на імя тав. Яраслаўскага, дзе яны парываюць з трацкісцкай апазіцыяй.

Ніжэй друкуем ліст тав. Антонава-Аўсеенка і адпаведную вытрымку з лісту тав. Крэсьцінскага.

Ліст тав. Антонава-Аўсеенка.

Паважаны таварыш! Мой ліст да палітбюро ад 28 кастрычніка, як і мой далучаны да яго ліст Троцкаму, зьмяшчалі ня толькі заяву аб згодзе ў аснаўным з палітычнаю лініяй большасьці ЦК і ня толькі асуджвалі барацьбу проці партыі, якая праводзілася апазіцыяй, але ў іх была зьмешчана і заява аб маёй нязгодзе з арганізацыйнаю палітыкаю ЦК.

Ад таго часу мелі месца падзеі, якія прымусілі мяне пераглядзець апошняе пытаньне. **І я прыйшоў да канчатковага выводу, што ПАЛІТЫКУ ЦК ЦАЛКАМ ПАДЗЯЛЯЮ І Ў АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ ГАЛІНЕ.**

Я далучыўся быў да апазіцыі і хацеў адкрыта ўмяшацца на яе баку ва ўнутры-партыйную барацьбу пасьля гутаркі з вамі ў сьнежні 1923 году. Менавіта пасьля гэтае гутаркі я паслаў у палітбюро недапусьціма востры ліст, дзе абвінавачваў большасьць партыі бальшавікоў у расколе партыі і г. д. Я павінен, перш за ўсё, менавіта вам, т. Сталін, сказаць, што бачу выразна, наколькі вы тады правільна адносіліся да Троцкага і яго апазіцыі, і наколькі я быў няправы. Вы зусім правільна зразумелі, што, пачаўшы размову аб перараджэньні старога кадру і супроцьставячы старцам моладзь, Троцкі выказваў сваё недавер'е да гістарычнае бальшавіцкае партыі і меў на ўвазе пабудову іншае партыі, якая парвала-б з традыцыямі бальшавізму і, у аснаўным, з яе ідэалёгіяй. Казаў праўду і т. Дзяржынскі, які на маё запытаньне (пры абмеркаваньні майго выключэньня з ПУР'у) у арганізацыйным бюро адказаў мне запіскаю—трэба змагацца з Троцкім і змагацца да канца, бо ў сваёй барацьбе з партыяю ён аб'ектыўна становіца асяродкам арганізацыі дробна-буржуазных рэакцыйных сіл (падаю на памяць гэтыя словы Ф. Д.).

Значнаю падпорай маёй пазіцыі ва ўнутрыпартыйнай барацьбе зьявіўся дакумант, які завецца „тастамэнтам Леніна“. Але папярэджаньні ў гэтым дакуманце ішлі па двох лініях. І, галоўнае, вы тав. Сталін, не адзін раз паказалі, што зазначэньні Леніна асабіста ад вас успрыймі, , што інтарэсы партыі для вас вышэй усяго.

Я ўпэўнен, што Ўладзімір Ільліч быў-бы цалкам з ЦК у яго барацьбе з апазіцыяю, толькі быў-бы больш хуткім на расправу.

Да гэтага мушу яшчэ дадаць: мяне несправядліва лічаць даўнейшым і прававерным «трацкістам». Я з Троцкім пачаў супольную працу з 1915 году ў Парыскім „Нашем Слове“. Але адразу я і Залеўскі арганізавалі ў рэдакцыі «Наше Слово» асобную групу, якая цалкам падзяляла погляды Леніна, і мы гэта выявілі, публічна адмежаваўшыся ад плятформы «нашаслоўцаў» («Наше Слово», 5 мая 1915 г.) Якраз нас пахваліў Ленін у «Социал-дэмократе», як левую ў «Нашем Слове», і водгук яго зазначэньня быў б-амі ў Парыжы (Беленькі) наладжан з намі арганізацыйны кантакт—арганізаваны „Клюб Інтэрнацыяналістаў“, у які Троцкі адмовіўся ўвайсьці, бо мы адхілілі плятформу трацкістаў. Не адзін раз у „Нашем Слове“ я выступаў проці рэшты яго рэдакцыі ў духу «Социял-демократа». Крыху пазьней я зноў востра разышоўся з Трацкім, змагаўся проці яго намеру, падтрыманага т. т. Лазоўскім, Мануйльскім і Л. Уладзіміравым, аформіць сваю партыю ў Расеі. Я лічыў, што калі заграніцаю мы можам мець асобную групу для літаратурнага прадпрыёмства, дык у Расеі можа быць толькі адна партыя інтэрнацыяналістаў—бальшавіцкая партыя.

Калі ў чэрвені 1917 году я прыехаў з-заграніцы ў Піцер, дык зараз-жа, для выкананьня сваёй думкі, увайшоў у партыю бальшавікоў, аб чым заявіў у «Правде», адмежаваўшыся ад міжрайённаў і абвінавацішы Троцкага, які быў тады па-за партыяю, у крайнім індывідуялізьме.

Кожны раз мне прыходзілася парываць з Троцкім якраз на пытаньні аб адносінах яго да партыі.

Я вінаваты перад партыяю ў тым, што не зрабіў усіх неабходных вываў ужо з паказаных першых сваіх з ім разыходзін. Мне здаецца, што, выказаўшы палітбюро яшчэ ў кастрычніку мінулага году сваю згоду з ім у асноўных палітычных пытаньнях, я магу зараз абмежавацца гэтым лістом.

З таварыскім прывітаньнем

Антонаў-Аўсеенка.

4 красавіка 1928 году.

Вытрымка з лісту тав. Крэсьцінскага.

Перапіска мая з Троцкім аб апазіцыі мае аднабаковы характар, бо складаецца толькі з маіх лістоў, якія засталіся без адказу. Лісты мае могуць быць цікавымі хіба толькі таму, што адбіваюць мае крытычныя адно іны да тактыкі апазіцыі ў розныя моманты ўнутрыпартыйнае барацьбы, якая ўрэшце прывяла да майго ідэёвага разрыву з апазіцыяю, не зважаючы на тое, што з большасьцю кіраўнікоў яе я быў зьвязан даўнейшымі і блізкімі адносінамі. (Я кажу аб ідэёвым, а не арганізацыйным разрыве, таму што арганізацыйнае сувязі з апазіцыяю ў мяне ня было).

З таварыскім прывітаньнем

Н. Крэсьцінскі.

22 сакавіка 1928 г.

Забойства пэрсідзкага міністра

ТЭГЕРАН, 7-IУ. У Лурыстане забіты пэрсідзкі міністр грамадзкае працы Абдула-хан Тахмасбы, пасланы для перамоў з лурыстанскімі паўстанцамі, а таксама для нагляду за пабудоваю шашы Хорэмабад-Дызфул. Забойства было ўчынена пры наступных абставінах: на Абдулухана-Тахмасбы, які варочаўся ў Баруджэрд з інспэкцыйнага падарожжа, напаў паўстанцкі атрад. У часе стычкі Абдула-хан быў цяжка паранены ў жывот.

Пасьля паведамленьня аб параненьні міністра грамадзкае працы, пэрсідзкі ўрад выслаў у Баруджэрд самалёт і двух дактароў, якім, аднак, не ўдалося застаць параненага жывым. Цела забітага будзе прывезена ў Тэгеран для пахаваньня.

БЯСЬСІЛЬЛЕ ДЭТЭРДЫНГА У ЗМАГАНЬНІ З САВЕЦКАЮ НАФТАЮ.

ЛЁНДАН, 3-IУ. Ангельскія нафтавыя прадпрыёмствы абвяшчаюць аб новым зьніжэньні цэн на нафтавыя прадукты ў разьмеры каля 4 кап. на балён (каля 4 літраў). Гэта тлумачыцца імкненьнем ангельскіх прадпрыёмстваў канкураваць з таннымі цэнамі РОП'у (таварыства гандлю расейскімі нафтавымі прадуктамі). Аднак, не зважаючы на новыя меры ангельскіх нафтавых прадпрыёмстваў, цэны РОП'у застануцца значна больш нізкімі, чымся іх цэны.

КРЫЗІС У АНГЕЛЬСКАЙ ТЭКСТЫЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

ЛЁНДАН, 3-4. Дзьве канфэрэнцыі прафсаюзаў рабочых баваўнянае прамысловасьці ва ўхваленых рэзалюцыях патрабуюць, каб урад назначыў камісію для абсьледваньня стану тэкстыльнае прамысловасьці і для распрацоўкі мер па ліквідацыі крызісу.

Шмат хто падкрэсьлівалі, што для ліквідацыі крызісу неабходна правесьці поўную ці частковую нацыяналізацыю баваўнянае прамысловасьці.

Клясавыя канфлікты.

ПАГРОЗА ЗВАЛЬНЕНЬНЯ ГАРНЯКОЎ У ЛЯНКАШЫРЫ.

ЛЁНДАН, 3-4. Уласьнікі капальняў у Лянкашыры абвясьцілі, што ў бліжэйшы час зьменшаць лік гарнякоў у мясцовых капальнях на 20 проц.

СТАЧКА НА КАПАЛЬНЯХ МІНІСТРА МЭЛЁНА.

НЬЮ-ЁРК, 7-4. Водлуг паведамленьня „Дэйлі Уоркер“, **забаставала 10 тысяч гарнякоў** Піцбурскае вугольнае кампаніі, уласьнікам якое зьяўляецца міністр фінансаў Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў Мэлён.

БАРАЦЬБА ШВЭДЗКІХ ДРЭВАапрацовачнікаў.

СТАКГОЛЬМ, 8-4. Швэдзкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: пасрэднічая камісія, арганізаваная для ўпарадкаваньня канфлікту на прадпрыёмствах па выпрацоўцы драўнінае масы, паведамляе, што дасягнута канчатковая згода аб ліквідацыі канфлікту. Праца на прадпрыёмствах па выпрацоўцы драўнінае масы пачнецца зараз-жа пасьля вялікодніх сьвят.

НАПАД ПАЛІЦЫІ НА КАМСАМОЛЬСКУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ.

БЭРЛІН, 9-IУ. Нямецкі камсамол выкарыстаў вялікоднія дні (у Заходняй Эўропе вялікдзень пачаўся 8-га красавіка) для арганізацыі ў Хемніцы агульна-нямецкага „спатканьня камуністычнае моладзі». Камуністычная моладзь, якая зьехалася з усіх бакоў Нямеччыны, арганізавала ўчора дэманстрацыю. Паліцыя напала на дэманстрантаў, спрабуючы іх разагнаць. Пры стычцы з дэманстрантамі паліцыя пусьціла ў ход халодную зброю, пераважна проці ўсіх удзельнікаў «спатканьня», якія прыехалі з Бэрліну. З ліку дэманстрантаў 19 чалавек паранена.

НАСТУП НА ЗАРАБОТАК У АНГЛІІ.

ЛЁНДАН, 3-4. Саюз рабочых прамысловасьці па вырабе пасулы затрабаваў павялічэньня заработку на 10-15 проц. Прадпрыёмцы ж, ня даўшы ніякага адказу прафсаюзу, падалі большасьці рабочым індывідуальныя паведамленьні аб зьніжэньні заработку ад 25 да 75 проц. Гэткае нячуванае зьніжэньне заработку выклікала моцнае абурэньне сярод рабочых.

ЗАМАХ НА ЛІДЭРА ТЫРОЛЬСКІХ ПРАМЫСЛОЎЦАЎ.

ВЕНА, 7-4. Аўстрыйскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе з Тыролю: у Іенбасе ўчынен замах на старшыню саюзу тырольскіх прамыслоўцаў Рэйтлінгера. Злачынца кінуў бомбу. Рэйтлінгер застаўся цэлым. Пакуль-што ня ўдалася напасьці на сьлед злачынцаў; вядома толькі, што злачынцы не зьяўляюцца прамысловымі рабочымі.

Экспорт з Польшчы ў СССР.

Экспорт з Польшчы ў СССР раўняўся ў 1923 -24 г.—1.500.000 даляраў, у 1924-25—5.800.000 даляраў, у 1925-26 г.—4.500.000 даляраў, а ў 1926-27 г.—6.000.000 даляраў.

Такім чынам, за памянёныя гады з Польшчы вывезена ў СССР на 17.800.000 дал., ад нас-жа вывезена за гэтычас 26.600.000 даляраў.

НАШ ВЫВАЗ У ПОЛЬШЧУ Ў 1927 ГОДЗЕ

У 1927 г. мы вывезьлі ў Польшчу збожжа на 8 000.000 дал., рыбы—на 750.000 дал., руды—на 870.000 дал. і розных птушак—на 122.000 дал.

Мукдэнцы перашлі ў наступ.

ПЕКІН, 8-IУ. Сюды надаслана тэлеграма з Ханьданю (на поўдні Чжылі) з паведамленьнем, што 27 корпус мукдэнцаў перайшоў рэчку Чжанхе, даганяючы войска Фынь-Юй-Сяна. Тэлеграма паведамляе, што паўночнае войска захапіла ў палон кавалерыйскі батальён арміі Фынь-Юй-Сяна разам з камандзірам.

Адначасна паведамляецца, што Чжан-Цзо-Лін перамагае ў ваколіцах Еньменьгуаню (горны перавал у паўночнай частцы Шансі). У Пекіне завяраюць, што шансійскае войска ў блізкім часе будзе замкнута ва ўласнай правінцыі і ня здолее даваць ніякае дапамогі Фынь Юй-Сяну.

АБВАСТРЭНЬНЕ АДНОСІН МІЖ ЯПОНІЯЙ І ПЕКІНАМ.

ПЕКІН, 8-IУ. Японскі орган „Манчжурыя Дэйлі Ньюс“ паведамляе, што намер Кітаю адмовіцца ад кітайска-японскае канвэнцыі наконт Паўднёва-Манчжурскае і Мукдэнска-Хайлунчэнскае чыгункі выклікала ўсеагульнае абурэньне ў Японіі. Водлуг слоў газэты, гэты намер Кітаю зьяўляецца часткаю пляну, які, ня лічачыся зусім з кітайска-японскім угаворам, ставіць сабе мэтаю зьвязаць Манчжурыю і Манголію з вонкавым сьветам уласнымі кітайскімі чыгункамі.

Нарэшце газэта піша: «Можна думаць, што Японія ўжыве такія захады, якія прымусяць Кітай зразумець, што будзе азначаць на справе гэтая спроба ўчыніць гвалт над найбольш цярплівым і прыяцельскім з суседзяў Кітаю.

Нямеччына будуе браняносец.

Рэйхстаг прыняў марскі бюджэт, у якім прадбачана будова аднаго браняносца. У часе дыскусіі аб марскім бюджэце абаронцы нямецкага флёту казалі, што Нямеччына павінна выкарыстаць усё тое, што дазволена ёй Вэрсальскім трактатам, які дае права немцам мець 4 браняносцы. Нямеччыне трэба мець хоць-бы такі флёт, які могбы забясьпечыць яе ад імкненьняў і прэтэнзіяў Польшчы, пагражаючай незалежнасьці Гданску і будуючай свой уласны порт Гдыню.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1-ай г. ночы).

ЭКАНАМІЧНАЯ СУВЯЗЬ МІЖ СССР І ЧЭХАСЛАВАКІЯЙ РАСЬЦЕ.

ПРАГА, 3-4. Прэзыдыум чэхаславацка-расейскае гандлёвае палаты ўхваліў рэзалюцыю, у якой са здаволеньнем вітае папярэднія перамовы ў галіне ўтварэньня чэхаславацка-савецкага гандлёвага ўгавору.

Прэзыдыум спадзяецца, што ў самым хуткім часе распачнуцца перамовы аб усіх гандлёва-палітычных і юрыдычных пытаньнях, вырашыць якія патрэбна ў інтарэсах чэхаславацкае прамысловасьці, каб эканамічная сувязь між Чэхаславацкай рэспублікай, з аднаго боку, і СССР і ўсходам—з другога, была пашырана і ўзмоцнена.

Адначасна прэзыдыум палаты ўхваліў распачаць перамовы з банкамі наконт фінансаваньня экспортных і імпортных апэрацый чэхаславацка-савецкага гандлю і аб заснаваньні акцыянэрнага таварыства для гандлю з СССР.

ВАКОЛ САВЕЦКАГА ЗОЛАТА.

НЬЮ-ЁРК, 7-IУ. Увесь друк зьмяшчае на бачным месцы паведамленьні аб пасылцы назад савецкага золата. Той факт, што французкі банк не перашкодзіў пасылцы савецкага золата, ацэньваецца, як доказ неабаснаванасьці прэтэнзіі на савецкае золата

СЭСІЯ ЦВК СССР.

МАСКВА. Адчыненьне трэцяй сэсіі ЦВК СССР чацьвертага скліку адбудзецца 11-га красавіка а 6-й гадзіне ўвечары.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

«ПАРЛЯМАНТ ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІКІ».

Пад такою назваю, але на польскай мове выйшла вельмі добра выданая, як піша «Роботнік», праца Г. Масьціпкага і Ў. Дзванкоўскага. У кніжцы зьмешчаны гістарычныя артыкулы аб польскім парляментарызьме, артыкулы, апісваючыя праграмы партый і іх дзейнасьць, жыцьцяпісы паслоў былога сойму і г. д.

183 ПРАТЭСТЫ НА ВЫБАРЫ.

У найвышэйшы суд паступіла праз акруговыя выбарчыя камісіі 183 пратэсты па справе ўневажненьня выбараў.

ЗВАЛЬНЕНЬНІ СТАРАСТ ЗА ВЫБАРНЫЯ РЭПРЭСІІ.

Звольнен з пасады Сарненскі стараста Ўзембло за рэпрэсіі і націск, якія ён рабіў у часе выбараў на выбрэльнікаў. Між іншым, ён арыштаваў кандыдата «Вызваленьня» б. пасла Кардоўскага. Спадзяваюцца, што і іншыя старасты, асабліва на «Усх. Крэсах», будуць звольнены.

КРАДЗЯЖЫ Ў КАСАХ ХВОРЫХ.

У касе хворых у Сасноўцы выкрыты вялізныя крадзяжы. Частка служачых арыштавана.

ПАДВЫШКА ЧЫГУНАЧНАГА ТАРЫФУ.

«Роботнік» паведамляе, што ў бліжэйшыя месяцы чыгуначны тарыф у Польшчы будзе падвышан.

ПАСОЛ ВЫГОДЗКІ Ў КАМЭРАХ ПАЛІТЫЧНЫХ ВЯЗЬНЯЎ.

«Кур. Віл.» (№ 77) паведамляе, што 3 сакавіка г. г. пасол Выгодзкі з дазволу пракурорскае ўлады адведаў у Віленскім астрозе на Лукішках вакаторых палітычных вязьняў, а між іншым нейкую Надзею Нікіфароўскую, якая сядзіць на Лукішках ужо больш 2 гадоў.

ЗНОЎ САМАЗАБОЙСТВА ВУЧНЯ ПОЛЬСКАЕ ГІМНАЗІІ.

Аб парадках і звычаях у польскай сярэдняй школе яскрава паказваюць досыць частыя выпадкі самазабойстваў вучняў.

25-га сакавіка вучань гімназіі ў Перамышлі дрэнна адказваў па лаціне. Настаўнік ня толькі паставіў нездавальняючую ацэнку ў журнале, але яшчэ і насьмяяўся з вучня, усяміваючы аб яго каханьні да аднае артысткі. Вучань даў апляўху настаўніку і скокнуў жыцьцё самагубствам, кінуўшыся пад поезд.

Некалькі тысяч вучнёўскай моладзі наладзіла дэманстрацыю на вуліцах места і на могілках пры пахаваньні самазабойцы.

Два ўзводы паліцыі (пешае і конпае) разагналі дэманстрантаў. Дом, у якім жыве настаўнік зацінь, ахоўваецца паліцэйскаю вартаю.

ПЭНСІІ ПРАВАСЛАЎНЫМ ПАПАМ.

Ад 1 красавіка г. г. у Польшчы будуць выплачвань праваслаўнаму духавенству пэнсію. Велічыня пэнсіі залежыць ад даходнасьці парафіі.

Ці не заплаціць гэта за падтрыманьне ўраду ў часе выбараў,—пытаецца віленленская аднадноўка «Красавік».

Беларускі Пасольскі Клюб.

„ЗМАГАНЬНЕ ЗА ІНТАРЭСЫ СЯЛЯН І РАБОТНІКАЎ“.

АРГАНІЗАЦЫЯ КЛЮБУ.

Радыкальныя беларускія паслы, прайшоўшыя ў новы сойм, аргарізавалі свой асобны пасольскі клюб, які часова назвалі імём сьпіску Навагрудзкае акругі—„Змаганьне за інтарэсы сялян і работнікаў“, ці карацей—Беларускі Клюб „Змаганьне“. У склад яго пакуль што ўваходзяць паслы: **ГАЎРЫЛІН ЯЗЭП**—*старшыня,* **ДВАРЧАНІН ІГНАТ**—*віцэ-старшыня,* **ГРЭЦКІ ІВАН**—*сэкратар і* **СТАГАНОВІЧ АЛЯКСАНДР**—*скарбнік.*

АСНОВА ПРАЦЫ „ЗМАГАНЬНЯ“.

Быць на варце інтарэсаў беларускіх сялян і работнікаў і змагацца за гэтыя інтарэсы ў саюзе з працоўнымі іншых нацыянальнасьцяў.

АДНОСІНЫ ДА ІНШЫХ ПАСОЛЬСКІХ КЛЮБАЎ.

Пастаноўлена ўвайсьці ў самы цесны кантакт з украінскім клюбам „Сель-Роб-Лявіца“ і завязаць па магчымасьці зносіны з блізкімі па духу клюбамі іншых нацыянальнасьцяў.

ПЕРШЫЯ ДНІ ПРАЦЫ Ў СОЙМЕ

Зараз-жа пасьля арганізацыі клюб пачаў дамагацца, каб зложыць дэкларацыю, маючую характар праграмы. Затым клюб прыгатаваў тры прапазіцыі: 1) у справе выбарных злоўжываньняў, 2) у справе арышту паслоў у дзень адчыненьня сойму і 3) у справе спыненьня суду над Грамадаю ў Вільні. Дзякуючы сталай адмове паслом клюбу ў слове на сэсіі сойму, складзен і пададзен камунікат у прэсу; паслы таксама разам з украінскім „Сель-Роб. - Лявіцай“ наладзілі абструкцыю-пратэст, дамагаючыся такім спосабам слова, Паслу Я. Гаўрыліку за гэта была зроблена маршалкам заўвага з занясеньнем у пратакол. Іншыя паслы сталіся ахвярай нападу з з боку пэпээсаўскіх „гэрояў“, якіх пяшчотныя вушы не маглі вытрымаць „галасу“ сялянска-работніцкіх паслоў.

ПРАЦА НА ДАЛЕЙШЫ ЧАС.

У зьвязку з пастановай сойму аб стварэньні надзвычайнае камісіі для расьсьледаваньня выбарчых злоўжываньняў, пастаноўлена зьвярнуцца да беларускіх працоўных гушчаў з заклікам зьбіраць усе матар'ялы выбарчых злоўжываньняў з боку адміністрацыі і перасылаць іх у Клюб для перадачы па назначэньні.

У бліжэйшым часе сабраць сходку, на якой апрацаваць больш дакладную праграму дзейнасьці.

Перад пачаткам працы польска-літоўскіх камісій.

Як вядома, польска-літоўская канфэрэнцыя ў Кёнізбэрзе пастанавіла склікаць у Бэрліне на 20 красавіка г.г. тры камісіі, якія павінны распрацаваць праэкты ўмоў па розных пытаньнях польска-літоўскіх сярэчак. Утвораны будуць тры камісіі: 1) эканамічна-транзітная, 2) бясьпечнасьці і адшкадаваньняў і 3) мясцовага руху.

СКЛАД ЭКАНАМІЧНА-ТРАНЗІТНАЙ КАМІСІІ.

У склад гэтае камісіі ўваходзяць з польскага боку—старшыня—п. Шмулякоўскі, сэкратаром—п. Лаціньскі, з літоўскага—старш.—дырэктар дэпартаманту—п. Заўніс.

СКЛАД КАМІСІІ БЯСЬПЕЧНАСЬЦІ І АДШКАДАВАНЬНЯЎ.

У склад гэтае камісіі ўваходзяць: з польск. боку—старш.—загадчык усходняга аддзелу мін. зам. спраў—п. Годлувко, сэкр.—п. Перкоўскі, з літоўскага—старш.—ген. сэкратар мін. зам. спра

Перад вясеньняй сяўбой.

Падрыхтоўка на Аршаншчыне.

Зямельныя крэдытныя органы акругі прарабілі шмат працы ў галіне падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы.

Па лініі акрэсальбанку выдана 343.235 р. крэдыту: на рабочую жывёлу — 62.800 р., машыны і інвэнтар—100.000 руб., трактары—2.000 руб., мінэральнае ўгнаеньне—32.050 руб., канюшыну—74.335 руб., на авёс і ячмень—54.450 руб., лён-даўгунец—12.000 руб. і на завадзкіх жарабкоў—5.600 руб.

У хуткім часе будуць выданы крэдыты для поўнага забясьпечаньня патрэб пасяўнай кампаніі: на рабочую жывёлу—30.000 руб., мінэральныя ўгнаеньні—10.000 руб., лубін—5000 руб., насёнаводзтва—13.000 руб., авёс і ячмень—20.000 руб., на кантрактацыю лёну—81.000 руб., на кантрактацыю бульбы—30.000 руб. і на пладаводзтва—30.000 р.

Ужо загатоўлена для сяўбы канюшыны 95,2 тон, вікі 346 тон—больш заданьня.

Загатоўлена на мяцовым рынку аўсу звычайнага—497 тон і ячменю звычайнага—83,4 тоны.

З угнаеньнямі крыху лепш: заданьне згодна заявак амаль выканана, суперфасфату трэба было—413 тон, загатоўлена—472 тоны, калійнай солі трэба было—50, ёсьць—33 тоны, сялітры трэба было—14 тон, ёсьць—3 тоны.

Сельска-гаспадарчы інвэнтар і машыны набыты поўнасьцю, заданьне выканана з перавышэньнем. Што-ж датычыцца інвэнтару для сельскіх малочных таварыстваў і арцеляў, то тут трэба сказаць, што справа абстаіць ня зусім добра: інвэнтар, як сэпаратары і інш., набыты няпоўнасьцю. Трактары таксама ня ўсе яшчэ прыбылі. З пяці трактараў мы маем даставленым толькі 1.

У сувязі з тым, што разнароднага насеньня крыху загатоўлена і небясьпекі не прадбачыцца ў час пасяўной кампаніі, Акрэа зьвярнула ўвагу на набыцьцё гатунковага насеньня для сяўбы.

КАНТРАКТАЦЫІ ЛЁНУ, КАНЮШЫНЫ І БУЛЬБЫ ПАГРАЖАЕ ЗРЫЎ. У гэтым годзе павінна быць закантрактавана бульбы 1855 гэктараў, канюшыны—300 гэктар. і лёну—300 гэктараў. Але ня гледзячы на тое, што ўжо праз які месяц распачнецца сяўба, ня ўтвораны яшчэ дагаворы на плошчу для пасеву і г. д. Гэта адзін з вялікіх недахватаў.

Зернаачышчэньне.

Трэба прызнацца, што з зернаачышчэньнем справа стаіць дрэнна. Тлумачыцца гэта тым, што несвачасова нізавыя органы і арганізацыі зьвярнулі на яго ўвагу і позна распачалі працу.

Напрыклад, ёсьць райёны, дзе сельсаветы і КСУ, а таксама і райённыя земадзелы нічога не зрабілі. Савецкія гаспадарчыя калгасы, камуны, арцелі машынныя таварыствы, очысьціўшы сваё насеньне не распачалі зараз жа очысткі насеньня суседзям-селянам заколічных вёсак і толькі насьля атрыманьня дырэктыў яны пачалі рабіць гэта.

Першымі ў акрузе ідуць па очыстцы насеньня райёны: Талачынскі, які выканаў 63 проц. заданьня, Амсьціслаўскі—60 проц. заданьня, Крупскі—56 проц., Круглянскі—44 проц. і Багушэўскі—52 проц. На апошнім месцы ідуць—Дрыбінскі райён— 6 проц. заданьня, Лядненскі—10 проц. і Дубровенскі—13 проц.

Мала завезена ўгнаеньня.

Да 1 красавіка ў БССР завезена: суперфасфату—97,5 проц., фосфарнай мукі—21,3 проц., калійнай солі—58,2 проц., тамашлаку—1,5 проц., азоцістага ўгнаеньня—25,0 проц.

Асабліва востра стаіць справа з угнаеньнем калійнай солі і тамасшлакам (імпортны тавар), якое патрэбна пры вясеньняй сяўбе.

Дрэнна абстаіць справа з загатоўкай лубіну.

Да 1 красавіка па Белсельсаюзу і Цэнтраземскладу загатоўлена насеньня малюшыны—112,5 проц., цімафейкі—107,6 проц., сэрадэлі—70,6 проц., вікі—141,0 проц., лубіну—8,8 проц., кораньплодаў—86,7 проц., лёну-даўгунцу—82,3 проц.

Пакуль што дрэнна абстаіць справа з загатоўкай насеньня лубіну.

Якое мінэральнае ўгнаеньне выслана для Беларусі.

Нядаўна ў нашай газэце друкаваўся тэлеграфны запрос НК РСІ БССР да НК РСІ СССР аб тым, ці саюзны НК Гандлю адгрузіў для Беларусі мінэральныя ўгнаеньні і чаму трыеры атрыманы з вялікім спазьненьнем.

Учора НК РСІ Беларусі атрымаў па гэтым пытаньні тэлеграфны адказ ад саюзнага НК Гандлю.

У тэлеграме зазначана, што па вестках Хімсындыкату для БССР 25 сакавіка выслана 95 проц. плянавага заданьня супэрфасфату.

Адносна калійнай солі і тамасшлаку, НК Гандлю паведамляе, што ўвесь кантыгент выкарыстан і гэтага ўгнаеньня для БССР больш няма.

Яшчэ 30 сакавіка зроблена распараджэньне Хімсындыкату аб тэрміновай высылцы для БССР сульфату амонія.

Гледзячы па адказу НК Гандлю СССР, Белсельсаюз у плян дастаўкі яму матар'ялаў ад „Госсельсиндиката" сёлета ня будзе ўключан. НК РСІ БССР узбудзіў паўторнае хадайніцтва аб уключэньні Белсельсаюзу ў плян дастаўкі „Госсельсиндиката".

Найцікавей вышла з трыерамі: мы пытаем, ці высланы для Беларусі трыеры, а ліцэнзіі на іх толькі некалькі тыдняў, як перадалі для рэалізацыі.

Нашы пасяўныя арганізацыі трымалі ліцэнзіі ў сябе да туль, пакуль ня прышла пара сеяць, а цяпер... чаму трыеры ў час ня прышлі?

Век жыві, век вучыся...

РСІ правярае падрыхтоўку да сяўбы.

Фонды беднаты раз'асігнаваны своячасова.

Нар. Кам. Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі правёў абсьледваньне Наркамфіну, Белсельбанку, Белсельсаюзу і Белкаапсаюзу. Абсьледваньне праводзілася для высьвятленьня, наколькі дастаткова і своячасова разьмеркаваны і накіраваны на месцы фонды крэдытаваньня і каапэраваньня беднаты.

Водлуг даных абсьледваньня да 27-га сакавіка, са сродкаў дзяржаўнага бюджэту было разьмеркавана 584.000 руб., ці 66,3 проц. усяго фонду крэдытаваньня беднаты і калгасаў. З гэтай сумы было накіравана на крэдытаваньне паасобных бядняцкіх гаспадарак 235.000 руб. і калгасаў — 349.000 руб. Гэткі процант разьмеркаваньня бядняцкіх крэдытаў, калі да пачатку палявых работ засталося яшчэ ў сярэднім каля месяца, можна лічыць здавальняючым. Апрача таго, Белсельбанк разьмеркаваў за рахунак сваіх прыбыткаў 57.180 руб. з вызначаных у фонд 58.800 руб.

Трэба адзначыць, што самы тэмп раз'асыгнаваньняў з боку Нар. Кам. Фінансаў—Белсельбанку, а апошнім—акругам абмяжоўваўся некалькімі днямі і праходзіць нармальна, за выключэньнем паасобных выпадкаў у мінулым, калі ад распараджэньня да фактычнага выкананьня праходзіла ўнутры Наркамфіну да 8 дзён і Белсельбанку—да 18 дзён. На гэту ненармальнасьць зьвернута ўвага і запрапанована ўзмацніць унутраны кантроль.

Менскае аддзяленьне Белсельбанку ў працягу 1 з пал. месяцаў не давяло да нізоўкі 4500 р., з асыгнаваных яму 15180 руб. Гэткае становішча тлумачыцца тым, што прадстаўнікі далёкіх сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў не зьяўляліся за атрыманьнем грошай.

Для зьліквідаваньня гэтай ненармальнасьці НК РСІ запрапанаваў Белсельбанку паставіць пытаньне аб увядзеньні ў практыку пераводу далёкім таварыствам грошай па пошце.

Апрача абсьледваньня ў цэнтры, НК РСІ накіраваў працаўніка ў акругу для праверкі нізавой сеткі, а разам з тым дадзена заданьне акруговым РСІ прасачыць за своячасовым разьмеркаваньнем фондаў на мясцох.

У неатрыманьні трыераў вінавата папяровая валакіта.

Побач з абсьледваньнем скарыстаньня фондаў беднаты, Раб.-Сял. Інспэкцыяй праверана забясьпечаньне БССР да пасяўнай кампаніі трыерамі.

Па гэтаму пытаньню РСІ выявіла папяровую валакіту, якая цягнулася са сьнежня да канца сакавіка, і няўзгоднвенасьць унутры апарату як некаторых органаў БССР, так у Наркамгандлі Саюза і ў Акцыян. Т-ве „Сельхозснабжение". З прычыны гэтых ненармальнасьцяў трыеры і дагэтуль яшчэ не атрыманы. У адносінах органаў БССР Нар. Кам. Раб.-Сял. Інспэкцыі прыняты належныя меры, а ў адносінах Нар. Кам. Гандлю Саюза і „Сельхозснабжения" матар'ялы накіраваны ў НК РСІ Саюзу.

Завоз аўса праходзіць вельмі слаба.

Водлуг даных Белсельсаюзу завоз насеннага аўса, у якім на мясцох адчуваецца крайняя патрэба, праходзіць недапусьціма слаба. Так, Цэнтрасаюз да 4-га красавіка выканаў заданьне па завозу ўсяго толькі на 9 проц., а між тым, тэрмін поўнай адгрузкі скончыўся 5 красавіка; адстае таксама і Хлебацэнтр, —якім адгружана ўсяго 61 проц. заданьня,— тэрмін-жа адгрузкі таксама скончыўся.

Нар. Кам. Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі аб усіх гэтых ненармальнасьцях давёў да ведама Наркому РСІ СССР і трэба спадзявацца, што недахваты будуць тэрмінова зьліквідаваны.

Павялічваем засеў траў.

Вопыт мінулага году навучыў, што веснавую кампанію трэба праводзіць загадзя. Сёлета падрыхтоўка пачалася яшчэ ў студзені.

План пасеўнай кампаніі прадугледжвае здаволеньне насеньнем у першую чаргу тых сялян, якія пераходзяць на шматпольле і беднаты.

Сельска-гаспад. крэд. та-вам будзе загатоўлена 2600 пуд. аўса, што складае 57 проц. заданьня. РайСУ ўжо загатовіў 2500 пуд. ярыны з агульнай лічбы 4000 пуд.

Да гэтага часу паступіла заявак на 150 п. супэрфасфату, тамасшлаку—250 п., калійнай солі 50 п. і фасфарыту—100 пуд. Сельска-гасп. крэд. та-ву прапанавана набыць у Белсельсаюзе 100 плугоў, 10 спрунжыновак і 15 акучнікаў для пасяўной кампаніі, якія будуць разьмяркованы праз машынныя та-вы.

Па райёну працуе 9 зернаачыстных машын, якімі прадугледжана ачысьціць 13000 пуд. збожжа і 1200 пуд. лёну. З 15-Ш выехаў пад кіраўніцтвам агранома абоз для папулярызацыі зернаачышчэньня сярод насельніцтва і будзе працаваць у 3 сельсаветах.

Плянам намечана арганізацыя насённага та-ва ў Верхмені і ўцягненьне ў гэту справу калгасаў і савгасаў.

Закладзена будзе 40 паказальных вучасткаў у сялян дасьледчыкаў і дэлегатак, калгасах і пасёлках з мінэральным і тарпяным угнаеньнем, два паказальныя сады ў пасёлках Кр. Бяроза і Дуброва, некалькі паказ. гародаў у калхозах і пасёлках.

Будзе пераведзена на шматпольле 90 гасп. на плошчы 450 дзес. і замацована запраэктаваных і нявыкананых у папярэднія гады на 700 дзес. у вёсцы Дынароўцы. Смалявіцкі райён выразна пераходзіць да культурнага травасеяньня і зьмяншэньня збожжавых. Так, засеў жыта сёлета будзе складаць па райёну 9300 дзес., а ў 26 г.—9818, аўса—6100 дз., а ў 26 г. 6210 дз. лёну—750 дз. супроць 541 дз. 26 г., бульба—6200 дз., а ў 26 г. 4200 дз. і г. д.

Значна скарачаецца папар і сёлета будзе ровен 2100 дз., а ў 26 г.—5000.

Неабходна агранаміі, усім арганізацыям павясьці шырокую кампанію за пашырэньне заявак на штучнае ўгнаеньне. М.

Смалявіцкі р., Меншчына.

Недахват штучнага ўгнаеньня.

У сувязі з надыходам вясны аддзяленьне Цэнтраземскладу шырока разгарнула сваю працу. Адчуваецца недахват спрунжыновак-пяцізубак, на якія з боку сялянства ёсьць значны попыт. Плугамі-ж і асыпнікамі попыты сялянства будуць задаволены цалкам, бо іх ёсьць вялікія запасы на цэнтральных складах.

Добра вядзецца і загатоўка насеньня некаторых кармавых траў. Так, вікі загатоўлена 2 вагоны, якія цалкам здаволяць патрэбы вёскі. Насеньня канюшны загатоўлена даволі—1500 п. адгружана ў другія акругі. Дрэнна ідзе справа з загатоўкай лубіну, якога няма яшчэ на складах ніводнага кілё.

Ня зусім добра абстаіць справа з штучным угнаеньнем. На складах ёсьць каля 4 вагонаў супэрфасфату, але ён пакінут для кантрактацыі лёну. Сялянства часта просіць прадаць штучнага ўгнаеньня, але прыходзіцца адказваць.

Будзе адчувацца і недахоп калійнай солі, якое адпускаюць толькі 1 вагон для мэліарацыйных таварыстваў. К—ч.

Слуцкі райён.

Да далейшых посьпехаў.

(Адзначэньне 5-хгодзьдзя Дзяржпляну БССР).

На ўрачыстым пасяджэньні Дзяржаўнае Плянавае Камісіі, разам з плянавымі органамі іншых ведамстваў, быў заслухан даклад члена прэзыдыуму Дзяржпляну т. **Пятровіча** аб 5-хгадовай працы Дзяржпляну.

Дакладчык падкрэсьліў тыя цяжкасьці, з якімі Дзяржплян праводзіў сваю працу спачатку. Пасьля, калі работа была ўжо наладжана, плянаваньне стала шмат лягчэйшым.

Цяпер Дзяржплян лёгка спраўляецца з пастаўленымі перад ім задачамі.



ПРЭЗЫДЫУМ УРАЧЫСТАГА СХОДУ ДЗЯРЖПЛЯНУ І ПЛЯНАВЫХ ОРГАНАЎ ІНШЫХ ВЕДАМСТВАЎ.

У новае 5-хгодзьдзе ён уступае з перакананьнем, што з гонарам выканае ўскладзеныя на яго абавязкі.

З прывітаньнем ад імя ўраду БССР выступіў старшыня СНК т. **Галадзед.** (Прамова т. Галадзеда будзе зьмешчана ў нашай газэце ў адным з наступных нумароў).

Тав. **Ігнатоўскі** кажа, што ў плянавым будаўніцтве вялікае значэньне мае дасьледчая праца навуковых устаноў і асоб. У спадчыну ад царызму мы атрымалі індывідуалістычны напрамак буржуазнай культуры. З прычыны гэтага, з пачатку нашай плянавай працы мы мелі некаторую перашкоду. Аднак, ня гледзячы на вялікую і цяжкую працу па ломцы індывідуалізму і пабудове новага калектывістычнага напрамку ў новай пралетарскай культуры, в гэтай працай мы справіліся пасьпяхова. У гэтым заслуга ня толькі навуковых устаноў, але і Дзяржпляну, бо ён адыгрываў надзвычайна важную ролю ў ломцы старой ідэалёгіі.

Дзяржплян удзягваў навуковыя і іншыя інстытуцыі ў плянавую працу і прывучаў іх да плянавага жыцьця, як неабходнай сустрэчнай часткі сацыялістычнай гаспадарі.

Цяпер, калі мы, дзякуючы нашым плянуючым органам, маем увязку і пэрспэктыву, наша праца пойдзе добра.

Вітаючы плянавых працаўнікоў з 5-хгадовым юбілеем іх працы,—закончыў т. Ігнатоўскі,—я жадаю, каб тая карысная і неабходная праца, якая праводзілася да гэтага часу, вялася і далей.

Тав. **Гэльтман** прывітаў Дзяржплян ад імя камвузу БССР.

— НЭП—пераходная стадыя ад капіталізму да сацыялізму. Гэта эпоха, калі ламаецца ўсё старое і будуецца новае. Адсюль выцякае тое вялікае значэньне, якое мы надаем Дзяржпляну.

Камуністычны Унівэрсытэт імя Ў. Леніна, на чале якога стаю я, з вялікаю ўвагаю сачыць за працаю Дзяржпляну, бо гэта праца мае значэньне ў выхаваньні партыйнага актыву.

Свае задачы Дзяржплян дагэтуль вырашаў пасьпяхова. Я перакананы, што і далей ён будзе пасьпяхова вырашаць усе пастаўленыя перад ім задачы.

Тав. Каплан выступіў з прывітаньнем ад міжсаюзнага аб'яднаньня спэцыялістаў.

Сход пастанавіў паслаць прывітальную тэлеграму тав. Крыжаноўскаму, які зьяўляўся арганізатарам працы Дзяржпляну БССР. Тэкст тэлеграмы даручана распрацаваць прэзыдыуму.

Было зачытана шмат прывітальных тэлеграм ад Дзяржпляноў Саюзных Рэспублік.

С. А.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Арганізоўваем камуны.

Ворша.

Сялянства Аршанскай акругі горача адгукнулася на лёзунг XV партызьезду аб калектывізацыі вёскі.

Вёска за вёскай у розных кутках акругі пачалі перабудоўваць свае гаспадаркі на новы сацыялістычны лад, пераводзіць старыя формы землякарыстаньня на новыя калектыўныя.

Некалькі дзён таму назад у **вёсцы Гразіна, Аршанскага райёну 44 гаспадары арганізавалі камуну. У в. Бардзікава, гэтага-ж райёну, арганізавалі камуну 9 гаспадароў.**

У сучасны момант камуны ўжо афармлены і ўключаны ў плян земляўпарадкаваньня.

8 гаспадароў вёскі Антонаўка, Аршанскага раёну, арганізавалі калектыўную гаспадарку. Гледзячы на іх 7 гаспадароў пастанавілі таксама арганізаваць калектыўную гаспадарку.

У вёсцы Макараўка, таго-ж райёну, ня гледзячы на ўсе перашкоды з боку кулакоў 9 сялян беднякоў арганізавалі сельска-гаспадарчую арцель. З боку кулакоў назіралася імкненьне перайсьці на хутарскую форму землякарыстаньня, але гэта не ўдалося. Райземаддзелам пастаноўлена правесьці земляўпарадкаваньне ўнечаргова ў арганізаванай арцелі. С.

Разьліў Дняпра.

Ворша, 9-4. У г. Воршы на р. Дняпро вада амаль ня выходзе з берагоў. Вялікі напор лёду пагражае разбурэньню маста праз Дняпро. Выклікана сапёрная рота, якая 3 дні фугасамі ўзрывае лёд. У часе ўздыму лёду быў забіты ледавешкай адзін з гледачоў. Зьнясло ў в. Дуброўне мост, які сіламі вайсковых частак і пажарнай дружыны затрыман у г. Воршы.

Быхаў, 9-4. Пачаўся разьліў Дняпра. У Быхаве некаторым вуліцам пагражае небясьпека затапленьня. Мясцовай уладай прыняты меры перасьцярогі. Жыхарам блізкіх да ракі вуліц прапанована быць падрыхтаванымі да высяленьня ў выпадку далейшага разьліву.

2.000 НОВЫХ ПАЙШЧЫКАЎ.

Віцебск, 7-IV. За апошнія 10 дзён сакавіка спажывецкая каапэрацыя каапэравала новых 1989 сялян, на 700 чалавек больш, чым у другую дзесяцідзённку. Пайвых узносаў сабрана за трэцюю дэкаду 16.372 руб.

ПАБУДОВА ХЛЕБНАГА ЗАВОДУ.

Гомель, 8-4. Прэзыдыум Акрвыканкому, улічваючы вельмі напружанае становішча хлебапячэньня ў Гомелі, прызнаў неабходным у бягучым будаўнічым сэзоне прыступіць да пабудовы хлебазаводу.

Каштоўнасьць пабудовы заводу вылічваецца да 210 тысяч рублёў. Пабудова пачнецца ў маі м-цы г. г.

МАЙСТЭРНІ ДЛЯ РАМОНТУ С.-Г. ІНВЭНТАРУ.

Ворша, 7-4. У гэтым годзе Белсельбанкам адпушчан 5-цігадовы крэдыт у патрэбнай колькасьці на пабудову 19 майстэрняў і кузьняў, якія прызначаны для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару і машын.

Кузьні і майстэрні будуць будавацца ў савгаспадарках, камунах і калгаспадарках.

Нядаўна на нарадзе прадстаўнікоў Акрсельбанку, Акрсельсаюзу і Акрэа былі вызначаны месцы пабудоў майстэрняў.

Пазыка ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

Рэалізацыя пазыкі ў Меншчыне.

СПАДЗЯЕМСЯ ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАЦЬ.

БЯРЭЗІНА, 9-4. За апошні тыдзень (да 8 сакавіка) тэмп рэалізацыі сялянскай пазыкі значна аслабеў: усяго рэалізавана на 517 руб. 50 кап., а з пачатку кампаніі—на 20590 руб. Такім чынам, дагэтуль заданьне па рэалізацыі пазыкі выканана на 53,9 проц. Прыняты меры да ажыўленьня тэмпу рэалізацыі, ёсьць надзея, што заданьне будзе выканана поўнасьцю.

63,4 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

ПЛЕШЧАНІЦЫ, 9-4. За час, з 1 да 8 красавіка ў райёне рэалізавана сялянскай пазыкі на 685 руб., а з пачатку-ж кампаніі рэалізавана на 15.860 руб., што складае 63,4 проц. заданьня.

ЗА ТЫДЗЕНЬ—1672 Р. 50 К.

КАПЫЛЬ, 9-4. Кампанія рэалізацыі пазыкі праходзіць з непаслабным тэмпам. За апошнія сем дзён рэалізавана пазыкі на 1672 руб. 50 кап., а з пачатку кампаніі—на 25.170 руб., што складае 48,6 проц. заданьня. Нашым працаўнікам неабходна памятаць лёзунг— «Ніводнай гаспадаркі без аблігацыі пазыкі» і яшчэ больш узмацніць працу.

ТОЛЬКІ... 11,2 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

АСТРАШЫЦКІ-ГАРАДОК, 9-4. За ўвесь час да 8 красавіка ў райёне рэалізавана сялянскай пазыкі толькі на 5617 р. 50 к., што складае 11,2 проц. заданьня. Трэба ўсё-ж адзначыць, што тэмп рэалізацыі за апошні тыдзень значна ўзмацніўся—рэалізавана на 1077 руб. 50 кап., але на гэтым ня трэба супакойвацца.

СЛАБА, ТАВАРЫШЫ!

СМАЛЯВІЧЫ, 9-4. За апошнія сем дзён у нашым райёне рэалізавана сялянскай пазыкі на 737 руб. 50 кап., а з пачатку кампаніі—на 8430 руб., што складае толькі 21 проц. заданьня. Нашы працаўнікі сёлі ведаюць, што справа з рэалізацыяй стаіць слаба, але ніякіх мер да ўзмацненьня тэмпу рэалізацыі ня прымаюць.

У Аршаншчыне рэалізацыя пазыкі ідзе слаба.

КОХАНОЎСКІ РАЙЁН.

Да гэтага часу ў райёне пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі распаўсюджана на 9012 р. 50 кап. Слаба вядзецца рэалізацыя пазыкі сельсаветамі і культурнымі працаўнікамі вёскі—настаўніцтвам.

ДУБРОВЕНСКІ РАЙЁН.

У райёне справа з рэалізацыяй пазыкі стаіць ня зусім добра, аб чым сьведчаць ніжэйнаступныя лічбы:

У КЛЯНОЎСКІМ С.-С. рэалізавана пазыкі на 200 руб., у БУДАЎСКІМ—на 115 руб., у ВЕРАЦЕЙСКІМ—на 112 руб. 50 кап. У РАСАСЕНСКІМ і ЧАРНАРУЧАНСКІМ с.-саветах НІЧОГА НЯ РОБЛЕНА адносна рэалізацыі пазыкі. Астатнія с.-с. рэалізавалі ў сярэднім на 40 руб. кожны.

Саюзы рэалізавалі наступныя сумы: сярод савецкіх працаўнікоў—на 252 руб. 50 кап., сярод паштова-тэлеграфных працаўнікоў—на 210 руб. Ня выканалі свайго заданьня старшыня фабкому фабрыкі «Дняпроўская мануфактура» Відэргауз і рабочы фабрыкі Каштанаў.

РАСЬНЯНСКІ РАЙЁН.

31 сакавіка прэзыдыум райёвыканкому падагуліў вынікі рэалізацыі сялянскай пазыкі ў райёне. Рэалізавана на агульную суму 5.600 руб.—заданьне выканана на 30 проц.

Лепшым субагэнтам райёну па рэалізацыі пазыкі зьяўляецца абаронца ў нарсудзе т. Давыдзенка, які распаўсюдзіў на 250 руб. (заданьне атрымаў на 200 руб.).

Кепска працуе мясцком працасьветы, які заданьне выканаў толькі на 10 проц.

Вялікім тормазам у рэалізацыі пазыкі зьяўляецца несвачасовая выплата сялянам грошай „Лесбалам", які праводзіць лесазагатоўкі на тэрыторыі райёну.

Польска-літоўскія перагаворы.

Чатырохдзённая гаварыльня і пісаніна, якою займаліся ў Кралевцы (Кёнігсбэргу) прадстаўнікі фашысцкае Польшчы і фашысцкае Літвы, скончылася. Ні адно з пытаньняў, высунутых на канфэрэнцыі, не атрымала вырашэньня—ні прынцыповага, ні практычнага. Усе справы перадаюцца на разгляд трох камісіяў, якія пачнуць сваю «працу» 20-га красавіка адначасова ў трох пунктах: Коўні, Варшаве і Берліне. Ужо адна гэтая ізаляванасьць аднае камісіі ад другое, выбар такіх трох месц дзеля іх працы замест аднаго агага пункту,—сьведчаць, што ўдзельнікі канфэрэнцыі не чакаюць і не жадаюць ад гэтых камісіяў інтэнсыўнае і плодатыўнае працы.

Перагледваючы афіцыяльны і афіцыёзны друк абі і другое стараны за час канфэрэнцыі, атрымліваецца ўражаньне, што абедзьве стараны пайшлі на канфэрэнцыю без асаблівае ахвоты і былі-б здаволены не зрывам, абы толькі вінуў за зрыў можна было ўзваліць на працаўніка. Польскі «санацыйны» друк іскольні не зьмяніў сваіх адносінаў да Літвы і да яе ўраду, няпрыстойныя выхадкі «Гласу Правды» цягнуцца далей. Пры такіх абставінах гаварыць аб шчырым імкненьні да паразуменьня ня прыходзіцца. Аб якім паразуменьні» з Літвою лятуціць пілсудчыкаўская Польшча, паказвае такі адрывак „Кур'ера Віленскага" за 1-е красавіка г. г.:

«Польшча прывязана з сабою да Кралеўца нязломнае імкненьне да згоды з працаўнікам, які ў працягу доўгіх вякоў быў зьвязаны з ёю неразрыўным вузлом прынязі і які толькі дзякуючы вялікаму гістарычнаму непаразуменьню ад яе адаліўся. Польшча гатова ў Кралеўцы зрабіць усё, каб гэтае вялікае гістарычнае непаразуменьне было зьлішчана» (падкрэсьлена нами).

Дзеля пілсудчыкаў незалежнасьць Літвы і аддзяленьне яе ад Польшчы на супроць таму, што было «на працягу доўгіх вякоў»,—ёсьць „вялікім гістарычным непаразуменьнем", і яны заяўляюць, што Польшча гатова дакладваць усіх стараньняў каб зьліквідаваць гэтае прыкрае ёй «гістарычнае непаразуменьне» — незалежнасьць Літвы. Кожны, хто хоць трохі знаёмы з гісторыяй польска-літоўскіх адносін, ахвотна паверыць гэтаму цьвярджэньню пілсудчыкаўскае газэты. Але тагды няма чаго дзівіцца, чаму літоўскі ўрад так падазрона адносіцца да ўсякіх польскіх прапаноў і ня вельмі верыць міралюбным польскім дэкларацыям.

Асноўным пытаньнем, якое перашкаджае наладжаньню нармальных дабрасусядзкіх адносін паміж сучасную Літваю і сучасную Польшчаю,—ёсьць справа дзяржаўнае прыналежнасьці Вільні, гэтага найвялікшага і найпрыгажэйшага места Беларусі. Калісьці гэтае места знаходзілася ў руках літоўцаў, цяпер ім валадае Польшча, але літоўская буржуазея ніяк ня хоча зьмірыцца з гэтым і ў імя сваіх «гістарычных праў» дамагаецца (упарта, хоць бяз посьпеху) звароту ёй Вільні. Віленскі псыхоз прышчэпліваецца таксама і шырокім народным масам Літвы праз школу, друк, касьцёл, войска і інш. Нават на дзьвярах чыгуначных вагонаў панаклейваны лёзунгі наманер такіх: «Літовец, не забывайся аб Вільні.» або: «Мы заяўляем сьвету: мы не супакоімся, пакуль не здабудзем Вільні». Адначасна з гэтым робіцца пробы пераканаць грамадзянскую думку Захаду праз рассыланьне адпаведных брашурак, мапаў, паштовак і г. д. Усе літоўскія ўрады вялі і вядуць гэтую дзейнасьць бязупынна і ў сучасны момант усякая проба літоўскага ўраду зьясьці з гэтае пазіцыі ў Віленскім пытаньні адразу выклікала бы рэзкае нездаваленьне сярод літоўскае буржуазеі і буржуазнае моладзі.

На Кралевецкіх перагаворах Вальдэмарас заявіў: «Я думаю, што мы аднавім дыпляматычныя зносіны ня хутка, бо літоўскі прэзыдэнт прыме польскага пасла толькі ў Вільні». Здавалася-бы: ясьней яснага, што Вальдэмарас не адступае ад традыцыйнае літоўскае лініі ў Віленскім пытаньні. Тым ня менш самы факт перагавораў з ворагам, захапіўшым «старадаўняе места Гэдыміна», настолькі раздразьніў літоўскую буржуазную моладзь, што ў Ковенскім унівэрсытэце дайшло да вострых выступленьняў на сходах проціў палітыкі ўраду.

У процівагу літоўскім заявам аб Вільні польскія газэты заяўляюць:

«Вільня можа быць сталіцаю толькі Вялікага Княства Літоўскага, але ніколі сталіцаю сучаснае Літвы» («Слово» 25-3).

«Парадаксальная палітыка літоўскіх нацыяналістаў капала і капае роў паміж Вільняю і этнаграфічнаю Літвою. З гэткага становішча спраў пешыцца польскі нацыяналізм. Але мы, Віленскія краёўцы, што кахаем традыцыі Вялікага Княства Літоўскага, традыцыі дзяржаўнатворчага гэнія валадароў даўнейшае Літвы, мы, дзеля якіх палітычным ідэалам будучыні ёсьць адбудаваньне адзінства земляў даўнейшага Вялікага Княства Літоўскага—мы ня маем з чаго пешыцца». («Кур. Вільн.» 30-3).

Па думцы польск. буржуазеі, Вільня можа стаць сталіцаю дзеля Літвы, але з умоваю, каб яна стала і сталіцаю дзеля Беларусі пад агульнаю ўладаю Польшчы, як гэта ўжо было пасьля Люблінскае вуніі. Зразумела, што такое вырашэньне не падабаецца ні літоўскай буржуазеі, ні народным масам Літвы і Беларусі.

„Газэта Варшавска" (4-IV) параўноўвае літоўскія прэтэнзіі на Вільню на грунце «гістарычных праў» з магчымасьцю (ці вярней—немагчымасьцю) прэтэнзіяў на падобным-жа грунце Англіі на французкую Нарманд ыю, Італіі—на французкую Савойю, Гішпаніі—на Італьянскую Сіцылію і заяўляе: «Гэткай-жа больш-менш натуры ёсьць і літоўскія прэтэнзіі на Вільню». Газэта польскае буржуазеі маўчыць пры гэтым, што на „гістарычным-жа праве" абгрунтоўвае свае дамаганьні на Беларусь і сама польская буржуазея і што гэтыя дамаганьні зьяўляюцца ня менш абсурднымі, чым літоўскія.

Віленскае пытаньне ня было ўключана ў афіцыяльную позву канфэрэнцыі, тым ня менш літоўская дэлегацыя ўвесь час старалася напамянуць аб тым, што яна ў віленскім пытаньні прытрымліваецца ранейшых поглядаў. Самай яскравай дэманстрацыяй падобнага роду было трэбаваньне адшкадаваньня за дзейнасьць генэрала Жэлігоўскага ў 1920 г. у часе захопу Вільні і часткі Віленшчыны. Па думцы літоўскае дэлегацыі, згода Польшчы на адшкадаваньне азначала бы ўкоснае прызнаньне спрэчных абшараў прыналежнасьцю Літвы. Няпрыняцьце-ж падобнага трэбаваньня сарвала-бы канфэрэнцыю, прычым віну можна было-бы ўзлажыць на Польшчу. Нечакана, аднак, польская дэлегацыя ў прынцыпе згадзілася на адшкадаваньне за дзейнасьць Жэлігоўскага, высоўваючы толькі контр-прэтэнзіі за зламаньне Літвою нэйтральнасьці ў часе савецка-польскае вайны і нанесеную такім чынам шкоду польскай армії. Пры враўнаважваньні гэтых прэтэнзіяў і контр-прэтэнзіяў Польшчы трэба было-б заплаціць ня шмат, але што вышла-бы? Па думцы літоўскае дэлегацыі, што Польшча гэтым укоснае прызнала-бы літоўскія правы на Вільню. А па думцы польскае дэлегацыі,—Літва, прыймаючы адшкадаваньне за Жэлігоўскага, гэтым самым сьцьвердзіла бы, што за адшкадаваньне яна дабрахвотна выракаецца далейшых прэтэнзій на Віленшчыну і лічыць справу закончанаю. Гэтак іменна і зразумела частка замежных карэспандэнтаў, зьехаўшыхся ў Кралевец. Такім чынам, трэбаваньне кампэнсацыі за Жэлігоўскага аказалася двохбакова вострым.

Калі літоўская дэлегацыя трэбаваньнем кампэнсацыі за жэлігоўшчыну думала дабіцца ад Польшчы ўкоснага прызнаньня Віленшчыны за літоўскую, дык польская дэлегацыя хацела дабіцца ад літоўскае адваротнага: укоснага прызнаньня Віленшчыны за польскую праз устанаўленьне мытнае лініі пры аднаўленьні зносін паміж Літвою і Польшчаю. Мытная лінія звычайна супадае з дзяржаўнаю мяжою і прызнаньне Літвою мытнае лініі па цяперашняй польска-літоўскай дэмаркацыйнай лініі азначала бы ўкоснае прызнаньне ёю гэтае лініі за дзяржаўную мяжу. Пры такім разьбіраньні ў тонкасьцях тэрміналёгіі і ўзаемнай недаверлівасьці, зразумела, што перагаворы не маглі даць значных пазытыўных вынікаў. Наўрад ці дадуць іх і камісіі.

На заканчэньне трэба ўспамянуць яшчэ аб паклёпах польскага друку на СССР і Нямеччыну, нібы-та яны падтрымліваюць упартасьць і нязьмірымасьць Коўні. Урад СССР даўно ўжо радзіў і польскаму і літоўск. ўраду ў імя агульнага замірэньня знайсьці шлях да мірнага паразуменьня. Гэта міратворчая роля савецкага ўраду спаткала прыхільную ацэнку нават у заходня-эўрапейскім буржуазным друку і дыпляматы, і выпады польскага буржуазнага друку робяць ураженьне сьвядомага фальшаваньня праўды.

М. С.

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Выбрыкі „адказнага“.

За дзесяць год існаваньня сав. улады працоўны люд прызвычаіўся да таго, каб з ім лічыліся, як з асобаю і паважалі яго як чалавека.

Аб гэтым ня толькі гавораць на розных сходах, гэтае ведае добра і адчувае кожны працоўны, але на вялікі жаль, гэтага да апошняга часу ня ведаюць некаторыя адказныя працаўнікі, нкім і ўлада іншы раз выпадкова даручае кіраўніцтва, і яны адчуваюць сябе надзвычайна вялікімі панамі, ня менш ад тых, якіх мы зьнішчылі 10 год назад.

У будынку сав. школы № 2 г. Менску, Ленінская 26, зьмяшчаецца групком працасьветы № 2. У гэтым групкоме на працягу больш двух год, па саўмясьціцельству тэхпрацаўнік 2-ой школы выконваў абавязкі рассыльнога за 10 руб. у месяц. На падставе таго, што падвышэньне пэнсіі адбылося ўсім катэгорыям працоўных наогул, я таксама папрасіў у адказнага сэкратара М. К. прыбаўку, або выдачы сродкаў на падноскі і атрымаўшы сталы адказ, стала адмовіўся ад займаемай пасады. Здавалася-б, што тут нічога страшнага няма і рабіць выбрыкі таксама няма чаго. Але сэкратар чалавек не такоўскі і паказаў сябе з найлепшага боку. 30-га сакавіка я зайшоў па старой прывычцы ў групком даведацца аб навінах па прафлініі і на мае прывітаньне: «Добрыдзень таварышы», пачуў адборную лаянку з боку адказ. сэкр. групкому № 2 і брык: «Пайшоў вон, тут табе больш няма месца, каб тваёй нагі тут ня было больш».

Гэты выбрык «адказнага» мяне ванчаткова зьбіў з панталыку. Ня веручы самаму сабе, я рашыў спытацца ў грамадзкасьці—няўжо-ж сапраўды паны яшчэ не зьявіліся і пачынаюць высоўваць і выяўляць свой твар на 11 годзе дыктатуры пралетарыяту.

У гутарцы з сваімі таварышамі па працы выявілася, што такая рыска за «адказным» водзіцца в даўных. Ня менш вобразна на прывітаньне атрымаў адказ і тэхпрацаўнік нашага калектыву т. Б—коў.

Просім рэдакцыю газэты адказаць, ці можа гэтак рабіць сэк. на 11 годзе рэвалюцыі ў той час, калі сакэ працасьветы даручае сэкратару стаяць блізка да мас.

Бурачкоў і Корзун.

„Рэжым эканоміі“.

(Забашавіцкая школа, Барысаўскага райёну.).

Рэжым эканоміі да гэтага часу не зачаніў Забашавіцкую школу, якая сабе сядзіць ціханька і нічога ў гэтым напрамку ня робіць.

А можа гэта вінават РВК, які таксама забыў пра рэжым? Справа вось у чым. З 1927-28 навучальнага году Забашавіцкая школа замест 4-хкамплектнай—стала 0,5, а пагэтаму далі ёй дзьве платныя адзінкі тэхнічных працаўнікоў, сэкратара і дзелаво а працы як аднаму, так і другому, а ць што зусім няма.

Адзін раз ці два ў м-ц прыдзецца напісаць пратакол. А далей? А далей зноў чакаюць. Ды адкуль жа будзе праца? Гэта-ж не канцылярыя РВК, ці с.-с. Мне здаецца, што РВК гэта пытаньне трэба вывучыць і паглядзець, ці патрэбны там два тэхнічныя працаўнікі ці патрэбна кожны м-ц выдаваць лішнія грошы? Па маёй думцы, досыць там і аднаго працаўніка, які з канцэлярыяй справіцца. А астатнія грошы пусьціць на набыцьцё вучэбных дапаможнікаў, ці інвэнтару, бо школа з гэтага боку дужа бедная.

КАЛІ ПАВІННЫ АДБЫВАЦЦА НАЗНАЧЭНЬНІ І ПЕРАМЯШЧЭНЬНІ НАСТАЎНІКАЎ?

Кожны год з 15 жніўня да 15—20 верасьня над настаўніцтвам вісіць «дамоклаў меч». «Пакінуць, ці перавядзь, а калі пакінуць, то колькі лекцый прыпадзе на маю долю», вось што настаўнікам не дае супакою.

Зранку і да вечара ў Акрана можна спаткаць амаль усіх настаўнікаў гор. Менску (у другіх акругах ма' быць тое самае). У гэтыя дні самае большае наведваньне настаўнікамі інспэктароў. Кожны пытае—як і што яму рабіць.

Але гэта між іншым, гэта толькі падыход, а на справе яго хвалююць інакшыя думкі: «Колькі-ж лекцый прыпадзе на маю долю?» І калі інспэктар дагадаецца і скажа тое, што трэба, тагды твар настаўніка зразу робіцца вясёлым, ветлым, не даслухаўшы інспэктара ён бяжыць хутчэй на вольнае паветра, пасьвістае, не заўважваючы сваіх знаёмых і хутчэй бяжыць ад «шуму людзкога» скарыстаць апошнія дні адпачынку.

Можна сказаць, калі настаўнік за летнія канікулы паправіцца, стане менш нэрвовым, то з 15 жніўня да 15 верасьня ён усё гэта страціць і стане больш сумным і маркотным. Здаровае цела, бадзёры настрой застаюцца толькі пажаданымі ідэаламі.

А за што?

... Каб настаўнік мог добра адпачыць за летнія канікулы, каб ён мог перагледзець спакойна патрэбны матар'ял і прачытаць навейшую літаратуру па свайму прадмету, абдумаць плян працы на надыходзячы год, разьмеркаваць належным парадкам свой час, патрэбна, каб усе перамяшчэньні, назначэньні і разьмеркаваньне прадметаў адбывалася перад летнімі канікуламі. Гэта спроба будзе карысна для настаўніцтва і будучай працы.

Прафпрацаўнік.

ПРАВІЛЫ КАРЫСТАНЬНЯ ІНТЭРНАТАМ ЦД АСЬВЕТЫ ТРЭБА ВЫПРАВІЦЬ.

Праяжджаючы з Слуцку ў Віцебск давялося мне грэшнаму раз ці два пераначаваць у інтэрнаце Цэнтр. Дому Асьветы. Стукаю ў парадныя дзьверы а 12 гадзіне ўночы. Дзядзька з-за дзьвярэй пытае,—чаго трэба. Кажу—пераначаваць, як настаўніку ў сваім інтэрнаце.

Ідзеце на двор і стукайце ў белыя дзьверы як мага мацней.

Пайшоў я на двор і пачаў стукаць. Стукаў, стукаў, толькі ўсіх суседзяў перапалохаў, а інтэрнат і яго загадчык сьпяць, хоць ты страляй з гарматы.

... Начую. Назаўтра прыходзіць малады хлапец са значком КСМ і запісвае мяне ў кніжку. Запісаўшы, патрабуе 40 к. За што, пытаюся,—а за тое, што начаваў, і падае мне правілы карыстаньня інтэрнатам.

Чытаю: **§ 4—карыстацца інтэрнатам з дзецьмі да 5 гадоў не дазваляецца.**

§ 17. Кіпяток для гарбаты.

§ 11. Прадастаўленьне ложак(?) праізводзіцца тэхпрацаўнікамі ад 9 да 11 гадз. раніцы і з 7 да 11 гадз. ночы. У крайнім выпадку (хвароба і інш.) можна зьвярнуцца і ў іншыя гадзіны.

Т. т. настаўнікі і настаўніцы, у каго ёсьць дзеці, не бярэце іх з сабою ў Менск, бо начаваць самі будзеце ў Д. Асьветы за 40 кап., а дзіця да 5 гадоў прыдзецца завезьці ў гасьцініцу за тры руб.

Ці прадастаўлялі каму-небудзь з Вас, настаўнікі і настаўніцы, **ложкі ці ложкі**, ад 9 да 11 гадзін раніцы і з 7 да 11 гадзін ночы, а калі быў выпадкам хворы, то і ў іншыя гадзіны? Мне ні ложак, ні ложкаў ніхто не прадастаўляў, а сам лёг на ложку і вымыў пад кранам ложку, бо яе нідзе ня было, каб памяшаць кіпяток у 11 гадз. раніцы.

Памойму трэба некатарым пунктам прыдаць сэнс, а § 4 зусім выкінуць.

С. Р.

Віцебск.

Школа і газэта.

З першага дню заняткаў у бягучым навучальным годзе наша Пухавіцкая сямігодка ўзяла рашучы курс на тое, каб кожны вучань ня толькі чытаў, але і выпісваў газэту.

У гэтай галіне працавалі як вучком, упаўнаважаны вучань па выпісцы газэт, так і настаўнік-грамадавед і іншыя, а пагэтаму цяпер мы можам канстатаваць цалкам здавальняючыя вынікі, напрыклад: за сакавік другі канцэнтр сямігодкі—5-а, 5-б, 6 і 7 клясы—226 вучняў выпісвалі розных газэт 129 экзэмпляраў, або 57,5 пр., у красавіку тыя-ж 226 вучняў выпісваюць 163 экз., або 71,5 проц.

Далейшая наша мэта—няма вучня без газэты і тут вучань бярэ прыклад з настаўніка, бо яны ўсе выпісваюць газэты, некаторыя нават па тры экзэмпляры. Як сярод вучняў, так і сярод настаўнікаў у сямігодцы ёсьць і селькоры, і ўпаўнаважаныя па распаўсюджваньню газэт. Дрэнна толькі адно, што вучань ня мае ў школе сталага месца для чытаньня газэт, хаця на паперы і лічыцца чытальня.

Пухавічы, Рэпка.

Суткі ў Чэрвенскім доме асьветніка.

РАНІЦА.

6 гадзін раніцы. Чэрвень яшчэ смачна сьпіць.

Дзядзька, з якім я прыехаў, пад'яжджае да Дому асьветніка. Падычаюся па ўсходах на пахлы ганак. Усходцы скрыпяць, нібы просяцца ў рамонт, імачай ім нядоўга засталося вяваць. Узяўся за клямку. Замкнёна. Не пасьпеў сыйсьці з ганку, як пачуў за дзьвярыма хуткія крокі. Адчыніліся дзьверы і перада мною жанчына ў спецадзеньні, якое, паміж намі кажучы, відаць пераробленае, толькі я ведаю які ўжо раз, з былое сукенкі. У руках мокрая анучка, якою яна канчала пераціраць падлогу.

—А, гэта ты! Ну заходзь, грэйся.

Гэта мяне спаткала загадчыца Дому Ірына Міхайлаўна, тая самая Ірына Міхайлаўна, якая працуе ўжо 27 гадоў па народнай асьвеце—раней настаўніцай, а апошнія 3-4 гады загадчыцай Дому асьветніка, тая самая, якая ўсіх сваіх знаёмых называе на „ты“ і гэта выходзіць у яе зусім проста, патаварыску.

Заходжу ў памяшканьне. У першым пакоі чытальня. Стаіць некалькі простых сталоў, на іх ляжаць апошнія газэты і часопісі на розных мовах. У кутку фісгармонія, якой ад нараджэньня, мусіць, гадоў са сто. На сьценах—насьценная газэта, плякаты, партрэты, малюнкі. Усё ў парадку. Прыбрана.

Разглядаю ўсё гэта, а клапатлівая Ірына Міхайлаўна ўсьпела ўжо паліць вазоны і выцірае пыл—яна тут універсальны супрацоўнік і загадчыца Дому, і прыбральшчыца, і апальшчыца, і сторож.

Другі пакой—для пачлежнікаў. Стаяць чатыры драўляныя ложкі з белымі, як сьнег, прастынямі, набітымі саломай падушкамі і засланыя парэньцямі коўдрамі.

У трэцім пакоі пэдагагічны музэй. Тут сабраны ўзоры вучнёўскіх прац са ўсяго райёну.

На сьценах разьвешаны вучнёўскія малюнкі і дыяграмы. На сталах мадэлі сельска-гаспадарчых прылад, абразчыкі хатніх тканін і г. д.

ДНЁМ.

У Доме пуста. Усе заняты на працы. Толькі што атрымана сьвежая пошта—Ірына Міхайлаўна зараз-жа яе ўсю праглядае выпісвае на лістку пікавыя для асьветнікаў артыкулы і вывешвае гэтыя лісткі на сьценах, каб асьветнік мог, ня траціўшы часу, зразу чытаць тое, што яго больш цікавіць.

Пачынаецца гутарка. Скарэдзіцца загадчыца на абмежаванасьць сродкаў. Вось паглядзі, страха цячэ, трэба паправіць, а грошай няма.

Гляджу на столь: пёкныя плямы на ёй ад заценкаў яскрава сьведчаць, што заміж страхі—рошата.

—Як-жа, пытаюся, вы абыходзіцеся, калі начуюць і настаўнікі і настаўніцы, усяго-ж адзін пакой для начлегу.

— Зусім проста,—чую адказ—пераносім частку ложкаў у чытальню, ці музэй, а калі ложкаў не хапае, дык хлопцы і на подлове сьпяць у смак. Наша настаўніцтва наогул не ганарыстае. У нас нават існуе сярод асьветнікаў самаабкладаньне на карысьць Дому—адзін плякат напіша, другі малюнак падаруе, трэці насьценгазэту перапіша і г. д. Былі выпадкі, калі асьветнікі і грашыма дапамагалі.

У час нашае гутаркі адчыняюцца дзьверы і ўваходзіць у чытальню барадаты дзядзька. Увайшоў, строс тут-жа з лапцяў гразь і кажа:—Вось прывёз у бальніцу настаўніка, дык ці можна майму каню на дварэ пастаяць, а мне тут абагрэцца. Ведаеце, хоць і сонейка прыгравае, але і ветрык модна навявае.

— Можна, можна, чаму не,—адказвае Ірына Міхайлаўна.

Дзядзька ўсеўся каля печы, якая якраз на яго шчасьце палілася, і грэецца, а загадчыца за мокрую анучу і тут-жа выцерла гразь, якую дзядзька шчыра строс з лапцей.

ВЕЧАР.

Заняткі па ўстановах скончаны.

Чытальня Дому паступова пачынае напаўняцца. Тут праводзяць вольны час ня толькі асьветнікі—Дом асьветніка наведваюць і ўрачы, і вайсковыя, і іншыя мясцовыя працаўнікі.

Прысутныя разьбіваюцца на групкі. У кутку сабралася чалавек шэсьць і чуць загрудкі не бярэцца—спрачаюцца аб сыстэме народнай асьветы—загадчык беларускай сямігодкі тав. Катлінскі гарой стаіць за сыстэму Балідкага, а райёны інспэктар асьветы тав. Ананові заводзіць, што неабходна ўнесьці папраўкі.

У другім кутку змагаюцца шахматысты Чуваць заўвагі:—Эх ты, трэба было пешку а2 на а3

Кінулася, між іншым, у вочы адна асаблівасьць:—ня было амаль ніводнага выпадку, каб калі небудзь «ненарокам» прапала газэта, ці часопісь з чытальні, чым ня могуць пахваліцца, напр. нашы менскія групкомы працасьветы.

Без 20 хвілін дванаццаць гадзін. Электрычнасьць раптам на момант патухла—гэта папраўджаньне, што станцыя праз 20 хвілін працу скончыць і пачне яе заўтра праз гадзіны дзьве пасьля заходу сонца.

Прысутныя разыходзяцца. Застаецца трое начаваць. Якраз субота, два настаўнікі прышлі, каб назаўтра в раніцы зрабіць свае справы.

Лажымся. Адзін з настаўнікаў жартуе:—Пашанцавала нам сёньня—няма ніводнай жанчыны, ня трэба рабіць перасяленьне. Спаць хоць і ня вельмі мякка, але пасьцель чыстая і паветра сьвежае.

Толькі пачало відненць, а Ірына Міхайлаўна ўжо на нагах—пачынаецца новы працоўны дзень. І так круглы год.

КАМЛЮК.

„ПОЛЫМЯ“ НА УКРАІНЕ. *)

Украінскае літаратурнае жыцьцё.

У тыя пяць дзён нашага прабываньня ў Харкаве, на якія мы мелі часу ў сваім распараджэньні, нам не ўдалося поўнасьцю пазнацца з усімі адценьнямі сучаснага украінскага літаратурнага руху. Вельмі ўжо вялікай была наша праграма, каб яе можна было цалкам выканаць. Размах культурнай чыннасьці і яе багатыя вынікі захапілі нас да таго, што мы не маглі не аддаць хоць некаторае ўвагі кожнай галіне культурнага жыцьця. Ахапіць яго падрабязным азнаямленьнем з нашага боку, зразумела, у пяць дзён было не пасьпець. Трэба спадзявацца, што выпадак нам у гэтым дапаможа. Узмацненьне сувязі паміж беларускай і украінскай культурай першым нашым наведваньнем Украіны толькі разгортваецца...

Але ня гледзячы на пяцідзённы наш побыт у Харкаве, мы ўсё-ж у вогуле сумелі вызьніць сабе сучаснае становішча украінскае літаратуры. Тым болей нам гэта было магчыма, што нам кожны дзень даводзілася гадзін тры-чатыры знаходзіцца ў аколеньні таварышоў украінскіх пісьменьнікаў.

Асноўным момантам, які характарызуе бягучы стан украінскага літаратурнага жыцьця, зьяўляецца, бязумоўна, факт ліквідацыі аб'яднаньня Ваплітэ. Заснаваньне гэтага аб'яднаньня адбылося каля двух гадоў таму назад. У шэрагі Ваплітэ ўвайшло шмат сяброў былушае пісьменьніцкае арганізацыі «Гарт» і некалькі сяброў з арганізацыі «Плуг». Мэтай Ваплітэ было вясьці ўзмоцненую працу па ўдасканаленьні літаратурнай творчасьці. Ваплітэ таксама адвідала мэтады палітпрасьветнасьці ў украінскай літаратуры. Пазьней віднейшы сябра яго і фактычны кіраўнік М. Хвілёвы выкінуў лёзунг пароту на Эўропу. Усё вышэйазначае плюс складанасьць украінскіх абставін, у якіх адбываецца павышаны тэмп культурнага будаўніцтва, былі сабралі вакол Ваплітэ некаторыя нацыяналістычныя думкі і настроі.

Адмежаванасьць Ваплітэ ад іных літаратурных арганізацый і абвостранасьць спрэчак склалі паміж імі варожыя адносіны. Здароваму, нармальнаму разьвіцьцю украінскай літаратуры гэта рэч шкодзіла. Знаходзіліся элемэнты, далёка няспрыяючыя савецкай уладзе, якім на руку было бачыць разладзьдзе ў адзіным, зьлітным фронце літаратурнага будаўніцтва. Цешылася, са свайго боку, некаторымі зьявішчамі ў савецкім украінскім літаратурным жыцьці і украінская белая эміграцыя. Як і ў нас, дзе «Узвышша» шчыра хваліцца Паўлюкевічам і Умястоўскім, украінскія эмігранты падкрэсьлівалі сваю сымпатыю да Ваплітэ. Нарэшце ў адным з нумароў органу Ваплітэ зьявіўся пачатак раману М. Хвілявога «Вальдшнепы», у якім няпрыхільнікі Ваплітэ ўгледзілі шмат адмоўнага да справы сучаснага савецкага будаўніцтва.

Некаторая заблутанасьць у пэрспэктыўным разьвіцьці украінскае літаратуры ў зьвязку з гэтым выклікала патрабу ў наладжаньні вялікага дыспуту. Дыспут гэты, на якім старшынёю быў Наркамасьветы т. Скрыпнік, цягнуўся некалькі вечароў і выклікаў надзвычайнае зацікаўленьне ў украінскіх літаратурных колах. На дыспуце была выяўлена поўнасьцю сітуацыя літаратурнага сёньня, былі падведзены падрахункі чыннасьці кожнае пісьменьніцкае арганізацыі, выкрыты яе зьмест і напрамак; нарэшце, паколькі гэта магчыма, былі намечаны далейшыя шляхі разьвіцьця украінскае літаратуры. Між іншым, у сваёй прадмове на дыспуце, т. Скрыпнік адмоўна адазваўся аб працы Ваплітэ і, у асобку, аб зьместу і ідэі раману М. Хвілявога «Вальдшнепы». На Украіне лічаць гэты дыспут адным з пахавальнікаў Ваплітэ. Якраз у час дыспуту быў атрыманы вядомы ліст ад М. Хвілявога з Вены, дзе ён быў на лячэньні. У гэтым сваім лісьце, надрукаваным у № 10 «Літаратурная Газэта» і перадрукаваным усімі газэтамі, М. Хвілёвы паведамляе, што ён канчаткова адказваецца ад сваіх думак, якіх ён трымаўся раней, зьнішчае свой раман «Вальдшнепы» і запрашае «сваіх літаратурных аднадумцаў рашуча адмовіцца ад тых формаў змаганьня на літаратурным фронце супроць вульгарызатараў, у якіх да гэтага часу вялася барацьба, бо гэткую барацьбу нямінуча выкарыстоўвае украінская контр-рэвалюцыя ў сваіх клясавых інтарэсах». Ліст зрабіў вагомнае ўражаньне і пацягнуў за сабою самароспуск арганізацыі пісьменьнікаў Ваплітэ. Трэба бесстароньня прызнаць, што акт самароспуску Ваплітэ нельга ня прызнаць правідловым. Інакшай яе сябры зрабіць не маглі, каб абараніць сябе і сваю творчасьць ад няпрошаных прыяцеляў... Гэту сваю думку мы выказалі ў таварыскай гутарцы з былышмі ваплітэўцамі, будучы ў Харкаве. Яны, зразумела, згадзіліся з намі... Але зусім інакшай паглядзелі яны на неасьцярожлівы намёк аднаго з нас аб Увзышшы, якое натужваецца падпасаваць сябе пад былушае Ваплітэ... Мы хутчэй-жа лакалізавалі створанае гэтым уражаньне ў нашых таварышоў украінцаў, даўшы зразумець ім, што Увзышша далёка ад былушага Ваплітэ... Тае якасьці ў творчасьці, тае цэльнасьці ў асобе кожнага былушага ваплітэўца, тае чуласьці да вібрацыі палітычных настрояў, якімі адзначылася Ваплітэ, яшчэ доўга не ставацьме для увзышшаўцаў. Ваплітэўцы моцным адсекліі ўдарам працягнутую ў іх бок руку няпрошанага прыяцеля, а увзышшаўцы гардзяцца цесным супрацоўніцтвам з рэшткамі нядаўняга эсэраўства...

Але гэта паміж іншым. У огуле самароспуск Ваплітэ зрабіў значнае парушэньне ў арганізацыйным жыцьці украінскае літаратуры. У гэтым аб'яднаньні знаходзіліся мацнейшыя літаратурныя сілы, значныя таксама і па сваёй колькасьці. Зараз ваплітаўцы знаходзяцца па-за межамі аб'яднаньня.

З апошніх наймацнейшым зьяўляецца усеукраінская сьпілка пралетарскіх пісьменьнікаў—ВУСПП. У гэта аб'яднаньне, паміж іншымі, уваходзяць: В. Корак, І. Мікітэнка, М. Доленга, І. Кулік і з кіеўскіх пісьменьнікаў Д. Загул. Органам ВУСПП'у ёсьць часопісь «Гарт», які рэдагуецца—В. Коракам, І. Кулікам, І. Мікітэнкам, В. Сосюрай, П. Усэнкам, М. Доленгаю і В. Юрынцом. Гэтай арганізацыі, бязумоўна, належыць цэнтральнае месца ў украінскім літаратурным будаўніцтве. Вакол яе, як цэнтру, будуць зьбірацца лепшыя сілы украінскіх літаратараў. Адзнака гэтага ўжо ёсьць і зараз. Гэтак, напрыклад, былышы сябра Ваплітэ, здольны пісьменьнік В. Сосюра ўжо ўвайшоў у шэрагі ВУСПП'у і стаў сябрам рэдакцыйнай калегіі яе органу.

Другім па сіле і значнасьці пісьменьніцкім аб'яднаньнем на Украіне ёсьць старая літаратурная арганізацыя „Плуг“. На чале гэтай арганізацыі стаіць выдатнейшы культурны працаўнік С. Піліпэнка. «Плуг» цьвёрда і ўверана захоўвае пастаўленыя ім пры заснаваньні ідэі і напрамкі ў літаратурным будаўніцтве. «Плуг» вядзе шырокую працу ў галіне арганізацыі маладых літаратурных сіл, якія выхоўваюцца ім з сялянскае і работніцкае моладзі, праводзіць літаратуру ў працоўныя гушчы. За час існаваньня «Плугу» у ім канчаткова аформіліся гэткія выдатныя пісьменьнікі, як П. Панч і Сьлесарэнка. Зараз у «Плугу» знаходзіцца, апроч другіх, С. Піліпэнка, Паніў, А. Галоўка і шмат іншых. Ворганам «Плугу» зьяўляецца часопісь «Плуг».

Трэцяю значнаю літаратурнай арганізацыяй стае «Маладняк». «Маладняк» заснаваўся нядаўна, але ў свае шэрагі пасьпеў ужо сабраць многа здольных маладых паэтаў і пісьменьнікаў. З іх ліку трэба адмеціць досыць буйную ядынку ў маладой украінскай паэзіі, якой зьяўляецца П. Усэнка. З другіх маладнякоўцаў заслугоўваюць сур'ёзнае ўвагі Т. Масэнка, П. Галота, О. Влызька, П. Лакіза і інш. Органам аб'яднаньня—ёсьць часопісь «Молодняк».

Апроч памянёных буйных літаратурных аб'яднаньняў на Украіне маецца яшчэ некалькі драбнейшых; да іх трэба аднесьці „Авангард“ на чале з В. Полішчуком, панфутурыстых з Сэмэнкаю, нэорэалістых з П. Рыльскім і інш. Вакол кожнае з гэтых арганізацый гуртуецца невялікая колькасьць пісьменьнікаў, часта вельмі здольных і выдатных, як паказаныя кіраўнікі іх. Сваіх часопісяў яны ня маюць, а іх сябры вядуць супрацоўніцтва ў тых журналах, якія не зьяўляюцца органамі таго ці іншага аб'яднаньня. Да гэткіх часопісяў належаць «Чырвоны Шлях», «Культура і рэволюцыя», „Культура і побыт“ ды інш.

Паміж іншым, на памянёным вышэй дыспуце ў Харкаве, у сваёй прамове т. Скрыпнік вельмі прыхільна адазваўся аб арганізацыі пісьменьнікаў. Авангард, сказаўшы, што яна адзначаецца ў сваёй працы здаровымі і цікавымі шуканьнямі і што ёй ухмыляецца будучына.

Паралельна з літаратурнымі арганізацыямі на Украіне (у Харкаве) існуюць дзьве літаратурныя ўстановы, гэта вядомы ўжо з папярэдніх нарысаў літаратурны будынак імя т. В. Блакітнага і мясцком пісьменьнікаў. Літаратурны будынак служыць асяродкам літаратурнага жыцьця, цэнтрам збору ўсіх пісьменьнікаў. У ім зараз налічваецца звыш трохсот сяброў. Мясцком пісьменьнікаў абслугоўвае сваіх сяброў па лініі прафэсыянальнай, адначасна клапоцачыся аб матэрыяльнай дапамозе пісьменьнікам. Гэтак у заслугу мясцкому пісьменьнікаў трэба аддаць ініцыятыву ў пабудаваньні дому пісьменьнікаў, аб якім мы ўжо пісалі. Таксама праз мясцком пісьменьнікаў здабыта для яго сяброў да дваццаці кватэр і выкладапатана да дваццаці курортных месцаў. (Для беларускіх пісьменьнікаў Наркамздраў БССР спагадзіва адказаў у двух мясцох. Якое можа быць суседзтва паміж Наркамздравам і беларускай літаратурай!).

Гэткім чынам, з паказанага ясна відаць, як шырока разгарнулася літаратурнае жыцьцё на Украіне! Ня дзіва, што вынікам яго зьяўляецца багатая, кіпучая творчасьць, што украінскі кніжны рынак насычаны вялікаю колькасьцю пісьменьніцкай прадукцыі. Умовы культурнага будаўніцтва на Украіне, на чале якога стаіць літаратура, зараз набылі таго размаху і тае грунтоўнасьці, якімі толькі і мог надзяліць украінскіх працаўнікоў Чырвоны Кастрычнік!

P. S. Аб'яднаньне «Полымя», пасылаўшае сваіх сяброў на Украіну, запрасіла на Беларусь наступных украінскіх пісьменьнікаў і культурных дзеячоў: П. Тычыну, Астапа Вішню, С. Піліпэнку, В. Полішчука, П. Панча, А. Любчэнку, М. Лебедзя і М. Быкаўца. Украінскія таварышы маюць прыехаць у першых лічбах траўня. У адзнаку іх прыезду аб'яднаньне «Полымя» і таварыства культурнае сувязі наладзіць урачыстае спатканьне і шэраг літаратурных вечарын.

(*Канец*).

ЦІШКА ГАРТНЫ.

*) Гл. „С. Б.“ № № 68, 71-73, 75, 78-79, 81 і 84.

АБ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ВЫХАВАНЬНІ АСЬВЕТНІКАЎ.

Пастаўленыя XV Зьездам УсеКП ва ўсю шырыню пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны, асабліва пытаньне аб рашучай перабудове на новы сацыялістычны лад сельскае гаспадаркі, вымагаюць ад усіх працоўных мас гораду і вёскі самага актыўнага ўдзелу ў практычнай працы па гэтаму будаўніцтву. Удзел у практычнай працы патрабуе павышэньня палітычнае сьвядомасьці мас, павышэньня ўм'ўю ведаў наогул і тэхнічных навы ў уздыму культуры працы, зьмены бытавых умоў жыцьця і г. д. Усё гэта цалкам упіраецца ў вырашэньне праблемы культурнае рэвалюцыі ў падрыхтоўку кадраў сацыялістычнага і культурнага будаўніцтва.

Асьветнікі, асабліва настаўнікі, самі зьяўляюцца часткаю гэтых кадраў і апроч гэтага на іх ускладзена вельмі вялікая і пачесная задача падрыхтоўкі, праз школы і іншыя палітасьветныя і навучальныя ўстановы, новых маладых кадраў. Зразумелая рэч, што гэтая падрыхтоўка вядзецца і павінна весьціся па дырэктывах і пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі.

Значныя колы асьветнікаў, ва ўмовах рэвалюцыйнай барацьбы і будаўніцтва, павысілі сваю грамадзка-палітычную сьвядомасьць, зьвязалі свой лёс з рэвалюцыяй і са справай сацыялістычнага будаўніцтва, выконваюць ролю памоцнікаў партыі на шляхох яе барацьбы і будаўніцтва, вылучылі з сваіх шэрагаў па ўсяму Саюзу ССР і ў нас на Беларусі шмат выдатных, адданых справе пралетарыяту рэвалюцыянэраў—актыўных барацьбітоў, якія зараз з посьпехам кіруюць рознымі галінамі сацыялістычнага будаўніцтва, але, ня гледзячы на відавочныя, значныя посьпехі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, мы сустракаемся са значнымі цяжкасьцямі і супярэчнасьцямі пераходнага перыяду. Аб гэтых цяжкасьцях XV-ы Зьезд сказаў наступнае: «Ня гледзячы на ўсё ўзрастаючую ролю сацыялістычнага гаспадарчага ядра, уздым вытворчых сіл эканомікі СССР нямінуча праходзіць частковым нарастаньнем клясавых супярэчнасьцяў. Прыватна-капіталістычныя колы гораду і вёскі, якія злучаюцца з некаторымі бюракратычнымі элемэнтамі савецкага і гаспадарчага апарату, імкнуцца ўмацаваць сваё працівадзейнічаньне наступу рабочае клясы, прабуюць зрабіць варожы пралетарскай дыктатуры ўплыў на пэўныя колы служачых і інтэлігэнцыі, на адсталыя колы саматужнікаў, сялян і рабочых. Гэты ўплыў праяўляецца таксама ў галіне культурна-палітычнай і ідэалёгічнай (пропаведзь зьменавехаўства, лёзунг «кулацкага сялянскага саюзу», шавінізм, антысэмітызм, пропаведзь буржуазна-дэмакратычных «свабод» і зьвязаны з ёю дробна буржуазны апазіцыйны лёзунг двух партый і г. д.)».

Памянёныя вышэй хваробы ў галіне культурна-палітычнай і ідэалёгічнай маюць месца і ў нашых асьветніцкіх колах, што праяўляецца асабліва сярод асьветнікаў, яшчэ слаба ахопленых савецкай грамадзкасьцю, найменш з ёю зьвязаных, якія не змаглі яшчэ вызваліць сябе ад уплыву старой дробнабуржуазнай ідэалёгіі.

Пленум ЦП Працасьветы ў сакавіку месяцы г. г. у мэтах яшчэ большага ўцягненьня асьветнікаў у актыўную практычную працу, у мэтах зьнішчэньня сярод асьветнікаў маючыхся вышэй паказаных хворых бакоў, паставіў ва ўсю шырыню пытаньне палітычнага выхаваньня асьветнікаў.

Увага кожнае прафарганізацыі і паасобнага асьветніка павінна быць зьвернута на:

1. Прынцыпы савецкае асьветы.

Савецкая асьвета грунтуецца на прынцыпах рэвалюцыйнага марксызму, работа ў школах і іншых культасьветных установах будзе тады каштоўнай і карыснай працоўным масам, калі яна будзе праводзіцца па гэтаму прынцыпу. Розныя іншыя ідэалёгічныя ўхілы, перажыткі ў справе асьветы зьяўляюцца асабліва небясьпечнымі, бо ідэалёгія складае самую сутнасьць асьветы, **«Сапраўдным савецкім пэдагогам зьяўляецца толькі той, які прыняў марксыцкую ідэалёгію, прапітаў ёю сваю пэдагагічную і грамадзкую дзейнасьць»** (пастанова пленуму).

2. Грамадзкая праца асьветніка.

Асьветнік, асабліва на вёсцы, зьяўляецца вялікаю культурнаю сілаю, таму, апроч сваёй непасрэднай вытворчай работы, ён павінен весьці грамадзкую працу. Што маецца зараз у нас:

На вёсцы пры дабраахвотнасьці грамадзкае працы мы назіраем наступныя моманты:

1. Паглыбленьне зьместу працы з боку тых асьветнікаў, якія шчыра і раней вялі яе.

2. Некаторы халадок з боку часткі асьветнікаў, якія вялі працу пад некаторым прымусам.

3. Нязначная частка зусім кінула працаваць, спасылаючыся на дабраахвотнасьць, прычым частка непрацуючых гаворыць, што школьная праца гэта і ёсьць грамадзкая праца. Праўда, грамадзкая праца павінна весьціся так, каб ад гэтага ня траціла непасрэдная работа ў школе, хаценчытальні і г. д., бо калі будзе дрэнна пастаўлена школа, то жаднага а ў т а р ы т э т у настаўнік, як г р а м а д ч ы к, мець ня будзе, але разам з гэтым нельга добра паставіць працу ў школе, калі настаўнік ня будзе цікавіцца і прымаць актыўнага ўдзелу як у акаляючым школу жыцьці, так і наогул у грамадзка-палітычным жыцьці краіны.

З гэтага выплывае бязумоўная неабходнасьць самага актыўнага ўдзелу асьветніка ў штодзённай практычнай грамадзкай працы.

У нас яшчэ да гэтага часу ёсьць асобныя выпадкі, калі той ці іншы асьветнік не разумее, або не жадае разумець клясавае сутнасьці палітыкі партыі на вёсцы. Былі, напрыклад, такія выпадкі, калі настаўнікі заяўлялі: «У нас ёсьць адна кляса Рабоча-Сялянская», або «Ніякага распластаваньня на вёсцы няма і ўсё сялянства адноль кавае». Грамадзкая работа такіх таварышоў ня толькі ня мае жаднае карысьці, але можа нарабіць шмат шкоды.

Улічваючы гэта, пленум вынес наступную пастанову: „п. 14. Задачы саюзу ў адносінах грамадзкай працы асьветнікаў указаны рашэньнямі VI-га зьезду саюзу, якімі ўсе прафорганы ў іх практычнай працы і павінны кіравацца. У арганізацыі і зьместу праводзімай асьветнікамі грамадзкай працы, пленум адзначае наступныя недахваты: асноўныя з іх—недастатковая клясавая яснасьць у працы асобных асьветнікаў і выпадкі ізаліраванасьці асьветнікаў у іх працы ад кіруючых і арганізуючых цэнтраў савецкай грамадзкасьці.

Небяспрынцыповае культурніцтва, а актыўная праца па эканамічнаму ўзмацненьню бядняцкіх элемэнтаў вёскі, арганізацыя батрацтва, падвышэньне іх культурнага ўзроўню, садзейнічаньне пераводу вёскі на асновы буйнай калактыўнай гаспадаркі, уздыму культурнасьці рабочае клясы і г. д.—такімі зьяўляюцца задачы грамадзкае працы.

Аднэй з гарантый посьпехаў у грамадзкай працы асьветніка, яе адпаведнасьці дырэктывам партыі і сапраўдным інтарэсам вёскі, райёну, гораду, зьяўляецца ўвязка гэтай працы ў агульную сыстэму працы, арганізацыі с а в е ц к а й грамадзкасьці д а д з е н а г а месца. Толькі апіраючыся на яе, пад агульным кіраўніцтвам мясцовых партыйных арганізацыяў, асьветнік можа даць каштоўную і патрэбную краіне грамадзкую працу».

У горадзе: Калі мы канстатуем, што вясковы асьветнік вядзе вялікую грамадзкую працу, **то ў горадзе з гэтым значна горш.** Мы да гэтага часу яшчэ не адшукалі больш менш выразных форм грамадзкае працы, не адшукалі глебы працы; вельмі рэдкія здарэньні прыцягненьня і скарыстаньня асьветнікаў на грамадзкай працы партыйнымі, савецкімі і іншымі арганізацыямі. На Менскай гарадзкой канфэрэнцыі асьветнікаў 25-Ш, калі мною было завострана пытаньне ўдзелу асьветнікаў гораду ў грамадзкай працы, некаторыя наста

У Савеце Народных Камісараў БССР.

(Пасяджэньне 6 красавіка г. г.).

На гэтым пасяджэньні разам з іншымі былі разгледжаны наступныя пытаньні.

АБ ВЫНІКАХ ГОРНА-ДАСЬЛЕДЧАЙ РАБОТЫ Ў БССР.

СНК выслухаў даклад Інбелкульту і садаклады ВСНГ і Дзяржпляну аб выніках горна-дасьледчай работы ў БССР у 1926-27 г. Дасьледчыя работы, праведзеныя ў 1926-27 г., выявілі наяўнасьць значных запасаў шэрагу карысных выкапняў, якія могуць быць скарыстаны для некаторых галін прамысловасьці. Так, выяўлена наяўнасьць кварцавых пяскоў каля Навабеліцы—Гомель і ў райёне паміж Гомелем і вёскаю Прудок па правым беразе р. Сож. Гэтыя пяскі па сваёй якасьці годны для вырабу ваконнага шкла і шкла для бутэлек, а часткай і для іншых шкляных вырабаў. Па сваёй колькасьці яны могуць забясьпечыць патрэбы ў мінэральным сырцу праэктуемай мэханізаванай гуты ў г. Гомелі пры максімальным заданьні ў 66 тыс. тон на тэрмін каля 50 год. На гэты самы тэрмін забясьпечваюць завод і залежы торпу з Кабылянскага торпавага масыву (плошча больш 2.500 дзесяцін). Выяўлена таксама наяўнасьць гліністых і мелавых мэргялей для вырабу цэманту ў райёне ст. Камунары-Журбін па чыгунцы Ворша-Унеча, дзе намечана набудаваць цэмантны завод. Запасы гэтых мэргялей дасягаюць 2,1 міліард. пуд., што можа забясьпечыць цэмантны завод з вытворчасьцю да 1 міліёна бочак на тэрмін больш 50 год. Выяўлены фасфарыты для вырабу фосфарна-кіслых і інш. угнаеньняў каля Клімавіч, чыгункі лініі Ворша-Унеча. Выяўлены даламіты высокай якасьці, годныя для вырабу гідраўлічнай вапны ў райёне ст. Дараганава чыгункі Асіпавічы-Урэчча Зах. чыгунак. Запасы гэтых даламітаў могуць забясьпечыць існаваньне заводу для вырабу вапны, з выпрацоўкаю 5 тыс. тон вапны ў год на тэрмін каля 30 год. Гэтыя даламіты прыгодны таксама для хімічнай прамысловасьці.

Праведзенымі дасьледваньнямі керамічных мэргялей у райёне г. Копысь, Аршанскай акругі, выяўлена, што запасы гэтых мэргялей дасягаюць прыблізна $2^1/_2$-3 міліён. пудоў. Прыняты меры да аховы і рацыянальнага скарыстаньня гэтых выкапняў. Праведзенымі рэкагнасцыровачнымі абсьледваньнямі ў Мазырскім райёне па р. Прыпяці выяўлена наяўнасьць торпаугліў высокай якасьці і значныя запасы іх.

Інбелкультам апрацаваны шэраг геолёгічных карт (геолёгічная карта Менскай губэрні, агульная схэматычная геолёгічная карта Беларусі і інш.) Геолёгічным Інстытутам Інбелкульту праводзіцца зьбіраньне і вывучэньне навукова-геолёгічных матар'ялаў аб адкладах, якія дасьледваліся ВСНГ. Апрача геолёгічных работ і дасьледваньняў, Інбелкульт праводзіць шэраг досьледаў у галінах прыродазнаўчых навук, якія таксама маюць вялікае значэньне.

Для апрацоўкі рэзалюцыі па заслуханых дакладах СНК утварыў камісію.

СНК АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ АКАДЭМІІ.

СНК прыняў пастанову па дакладу Беларускай Дзяржаўнай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі. Пастановаю адзначаецца ўзмацненьне Акадэміі навуковымі сіламі, правядзеньне рацыяналізацыі праз пераход на штатную сыстэму, некаторае паляпшэньне спэцыяльнага складу студэнцтва, а таксама павялічэньне студэнтаў беларускай нацыянальнасьці, адчыненьне Сялянскага Унівэрсытэту, пашырэньне беларусізацыі сярод малодшых навуковых працаўнікоў і шэраг іншых дасягненьняў. Адначасна СНК адзначыў і шэраг недахопаў у рабоце Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, як: невыстарчальнае разьвіцьцё навукова-дасьледчай працы, невыстарчальны тэмп беларусізацыі Акадэміі, невыстарчальнае прыстасаваньне факультэтаў Акадэміі мэтам індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, невыстарчальны ўплыў Акадэміі на разьвіцьцё сельскай гаспадаркі вакольнага насельніцтва і інш.

У далейшай рабоце СНК запрапанаваў Акадэміі правесьці наступныя мерапрыёмствы: працягнуць і надалей працу па рацыяналізацыі з мэтаю скарачэньня адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў, праводзіць пашырэньне і паглыбленьне беларусізацыі, устанавіць сталы падлік акадэмічнай і навуковай працы навуковых працаўнікоў, прыняць належныя меры да гаспадарчага ўзмацненьня сельска-гаспадарчых фэрм Акадэміі. Прызнана патрэбным уключыць сельска-гаспадарчыя фэрмы Акадэміі ў плян крэдытаваньня. НК Асьветы і Праўленьню Акадэміі даручана выканаць ранейшую пастанову СНК аб забесьпячэньні Акадэміі электрычным асьвятленьнем. НК Асьветы разам з НК Земляробства даручана распрацаваць мэтавыя ўстаноўкі вытворчай практыкі і плян задавальненьня ёю студэнтаў Акадэміі.

АБ НОРМАХ ВЫПРАЦОЎКІ ЛЕСА-ЎПАРАДЧЫКАЎ.

СНК пастанавіў зьнізіць норму выпрацоўкі лесаўпарадчыкаў з 4.347 гэкт. для здымкавых работ за 6 месяцаў да 4 тыс. гэкт. і з 8.694 гэкт. для таксацыйных работ—да 8 тыс. гэкт.

Рашучыя меры да беларусізацыі БДУ.

НАРКАМАСЬВЕТЫ І ПРАЎЛЕНЬНЮ БДУ ЗАПРАПАНОВАНА ПАСКОРЫЦЬ І ПАГЛЫБІЦЬ ТЭМП БЕЛАРУСІЗАЦЫІ БДУ.—НАРКАМАСЬВЕТЫ І БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВУ ПРАПАНУЕЦЦА ПРЫСТУПІЦЬ ДА ВЫДАНЬНЯ ПАДРУЧНІКАЎ ДЛЯ БДУ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ. — МАСАВАЯ ПРАЦА СЯРОД СТУДЭНЦТВА ПАВІННА ВЕСЬЦІСЯ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

Па дакладу рэктара БДУ прафэсара Пічэты аб ходзе беларусізацыі Нацкамісія ЦВК БССР у сваёй рэзалюцыі адзначыла цэлы шэраг дасягненьняў у гэтай галіне. Поруч з гэтым Нацкамісія адзначае наступныя цяжкасьці і недахопы ў справе беларусізацыі БДУ.

Унівэрсытэт мае абмежаваную колькасьць навуковых працаўнікоў, якія могуць весьці выкладаньне на беларускай мове. Ёсьць частка навуковых працаўнікоў, якія толькі фармальна адносяцца да вывучэньня беларускай мовы і пераводу выкладаньня сваіх дысцыплін на беларускую мову.

Некаторая частка студэнцтва таксама адносіцца фармальна да беларускай мовы і нават заўважваецца нежаданьне ўжываць гэту мову.

Дзеля зьнішчэньня ўсіх гэтых недахопаў і дзеля паглыбленьня беларусізацыі, тэмп якой да гэтага часу праводзіўся слаба, Нацкамісія ЦВК намеціла цэлы шэраг мерапрыёмстваў.

Вакол гэтага пытаньня трэба мабілізаваць усю грамадзкасьць БДУ Праўленьне БДУ павінна паглыбіць тыя дасягненьні, якія ўжо ёсьць, а таксама праводзіць і надалей рашучую лінію ў справе намечаных мерапрыёмстваў па беларусізацыі, узмацніўшы тэмп правядзеньня яе, каб заданьне было выканана ў тэрмін.

Наркамасьветы і Праўленьню БДУ прапануецца паскорыць выкананьне пастаноў ураду БССР аб папаўненьні кадраў навуковых працаўнікоў беларусамі як шляхам далейшага прасоўваньня і перападрыхтоўкі мясцовых навуковых працаўнікоў, гэтак сама і шляхам запрашэньня навуковых працаўнікоў беларусаў з іншых сав. рэспублік.

Нацкамісія ЦВК лічыць неабходным далейшае пашырэньне інстытуту асьпірантаў, дзеля чаго Наркамасьветы даручана распрацаваць гэта пытаньне і ўнесьці на зацьверджаньне адпаведных органаў. Дзеля апрацоўкі навуковай тэрміналёгіі Праўленьню БДУ даручаецца ўвайсьці ў сувязь з Інбелкультам і прыняць меры да ўцягненьня ўсіх навуковых працаўнікоў у гэтую працу.

У сваёй пастанове Нацкамісія звачвае вялікую ўвагу на выданьне падручнікаў на беларускай мове. Наркамасьветы і Белдзяржвыдавецтву даручана прыступіць да выданьня патрэбных падручнікаў для БДУ, шляхам выданьня новых, а таксама перакладу з іншых моў.

Нацкамісія зварачвае ўвагу на тое, каб студэнцтва пры прыёме ведала беларускую мову. З другога боку, студэнцкім арганізацыям прапануецца завастрыць пытаньне аб актыўным удзеле ўсіх студэнтаў у практычным правядзеньні беларусізацыі ў БДУ перавёўшы зараз-жа ўсю масавую працу сярод студэнцтва на беларускую мову. Дзеля пашырэньня ўжываньня ў штодзённым жыцьці беларускай мовы, Нацкамісія прапануе Праўленьню БДУ, каб тыя навуковыя працаўнікі, якія ў той ці іншай ступені ўладаюць беларускай мовай, у сваіх зносінах з студэнтамі карысталіся ёю. Тыя-ж навуковыя працаўнікі, якія ўжо перайшлі на беларускую мову выкладаньня, павінны паглыбляць свае веды ў гэтай галіне і паляпшаць якасьць мовы.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра дапаўненьне пастановы ЦВК і СНК БССР «Аб умовах і парадку высяленьня грамадзян з занятых імі памяшканьняў у гарадох і мястэчках».

На падставе пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР за 15 лютага 1928 г. «Пра дачу органам Народнага Камісарыяту Вайсковых і Марскіх Спраў права адміністрацыйнага высяленьня з замацаваных за ім дамоў» (З. З. СССР 1928 г., № 13, арт. 110) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць унесьці ў сваю пастанову за 19 лютага 1927 году «Аб умовах і парадку высяленьня грамадзян з занятых імі памяшканьняў у гарадох і мястэчках» (З.З. БССР 1927 г., № 12, арт. 42) наступныя зьмены:

1. Пункт «К» арт. 2-га запісаць у наступнай рэдакцыі:

«З казарменых памяшканьняў—асоб, не знаходзячыхся на службе ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі або ва ўстановах Народнага Камісарыяту Ваенных і Марскіх Спраў, пры ўмовах і ў тэрміны, зазначаныя ў разьдзеле II гэтае пастановы.

З дамоў, замацаваных за органамі Народнага Камісарыяту Ваенных і Марскіх Спраў—асоб, не знаходзячыхся на службе ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, апроч сем'яў кадравага начальніцкага складу, пры ўмовах і ў тэрміны, зазначаныя ў разьдзеле II гэтае пастановы».

2. Пасьля арт. 9 запісаць арт. 9-а ў наступнай рэдакцыі:

„Асобы, якія жывуць у дамох, замацаваных за органамі Народнага Камісарыяту Ваенных і Марскіх Спраў і не знаходзяцца на службе ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, апроч сем'яў кадравага начальніцкага складу, могуць быць выселены ў адміністрацыйным парадку па патрабаваньні тых устаноў, якім гэта права дадзена Народным Камісарыятам Ваенных і Марскіх Спраў».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

29 сакавіка 1928 году.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

О ДОПОЛНЕНИИ ПОСТАНОВЛЕНИЯ ЦИК И СНК БССР «ОБ УСЛОВИЯХ И ПОРЯДКЕ ВЫСЕЛЕНИЯ ГРАЖДАН ИЗ ЗАНИМАЕМЫХ ИМИ ПОМЕЩЕНИЙ В ГОРОДАХ И СТЕЧКАХ».

На основании постановления ЦИК и СНК Союза ССР от 15 февраля 1928 г. „О предоставлении органам Народного Комиссариата по Военным и Морским Делам права административного выселения из крепленных за ним домов" (С.З. ССР 1928 г., № 13, ст. 110) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют внести свое постановление от 19 февраля 1928 г. «Об условиях и порядке выселения граждан из занимаемых ими помещений в городах и местечках» (С.З. БССР 1927 г., № 42, ст. 42) следующие изменения:

1. Пункт «К» ст. 2 изложить в следующей редакции:

«Из казарменных помещений—лиц, состоящих на службе в Рабоче-Крестьянской Красной Армии или в учреждениях Народного Комиссариата по Военным и Морским Делам, при условии и в сроках, указанные в главе II-й настоящего постановления.

Из домов, закрепленных за органами Народного Комиссариата по Военным и Морским Делам—лиц, не состоящих на службе в Рабоче-Крестьянской Красной Армии, кроме семей кадрового начальствующего состава, могут быть выселены в административном порядке по требованию тех учреждений, которым это право предоставлено Народным Комиссариатом по Военным и Морским Делам».

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БСС Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

29 марта 1928 г.
г. Минск.

ХРОНІКА.

Рыхтуйцеся да „Дню Лесу".

Для належнага правядзеньня ў сёлетнюю вясну кампаніі «Дню Лесу» пры Наркамземе створана цэнтральная камісія з удзелам партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый. Апроч гэтага, у акругах арганізаваны акруговыя, у райёнах—райённыя і ў сельсаветах—сельскія камісіі па правядзеньні „Дню Лесу". У Менску, пры мясцовым бюро лясных спэцыялістаў, створана спэцыяльная камісія, якая будзе кіраваць усімі работамі па правядзеньні «Дню Лесу» ў Менску.

Кампанія «Дню Лесу» распачнецца 15-га красавіка і закончыцца 15 мая. Сёлета гэта кампанія павінна прыняць шырока-масавы, народны характар. Да практычнага выкананьня гэтае задачы, г. з. лесаадпаўленьня, пасадкі грамадзкіх паркаў, садоў, прысадаў, бульвараў, вуліц, упрыгожаньня жывой зеляніны нашых устаноў і інш. работ будзе прыцягнута наша вучнёўская і рабочая моладзь і чырвоаармейцы вайсковых часьцей. Дзеля папулярызацыі гэтай справы ў рабочых клюбах, на сходах сялян і ў чырвоаармейскіх часьцях будуць чытацца лекцыі і даклады лясьнымі спэцыялістамі.

У часе гэтай кампаніі асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на лясы мясцовага значэньня. Тут прадугледжваецца аблясеньне новых дзялянак, ачыстка лесу ад ламачча і гальля. Дзеля выкананьня гэтай задачы кожнаму лясьніцтву дадзена дырэктыва засадзіць пэўны пляц лесам. Таксама мяркуецца правесьці значную работу па пасадцы прысадаў абапал нашых дарог, вуліц у мястэчках і інш.

Усімі работамі па лесаадпаўленьні і пасадцы дроў будуць кіраваць мясцовыя лясныя працаўнікі.

ШЭРАГІ АЎТАДОРУ РАСТУЦЬ.

Менскі акруговы Аўтадор арганізуецца пасьпяхова.

У чацьвер, 6 красавіка, адбылося чарговае (другое) пасяджэньне праўленьня Менскага акруговага Аўтадору. Абгаварваліся пытаньні арганізацыйнага парадку.

Для арганізацыі вясковых ячэек Аўтадору ў акрузе выдзелен кіраўнік дарожнай сэкцыі тав. Даўдыш, а для ўтварэньня гарадзкіх—арганізацыйная тройка ў складзе таварышоў: Цапкаватага, Левіна і Шымановіча.

Праўленьне акруговага Аўтадору арганізавала справачны аддзел, дзе можна атрымаць усе спраўкі арганізацыйнага характару штодня ад 10 да 1 гадзіны дня і ад 6 да 9 гадз. вечара.

Арганізацыя курсаў дарожных майстроў.

15-га красавіка ў Віцебску адчыняюцца курсы Аўтадору для падрыхтоўкі дарожных майстроў. Затрыманьне в адчыненьнем курсаў вышла ў сувязі з тым, што Аршанскі АВК, як частка Віцебскага Аўтадору, ня ўпёс своячасова апаведных сродкаў.

На ўтрыманьне курсаў Віцебскі АВК адпусьціў 1.100 руб. і Полацкі—850 руб.

Колькасьць членаў Віцебскага Аўтадору з кожным днём узрастае. Так, на заводзе «Красный Металлист» ячэйка Аўтадору налічвае звыш 300 чалавек. Гэта ячэйка мяркуе зрабіць сабе маторную лодку і адгамантаваць аўтамабіль «Форд», каб пасьля на іх навучыць язьдзе ўсіх членаў ячэйкі Аўтадору.

Самаабкладаньне на будаўніцтва дарог.

Мазырскае аддзяленьне Аўтадору шпарка разгортвае сваю працу. Да гэтага часу ў Мазыры ўвайшло ў арганізацыю каля 200 членаў.

Юрыдычнымі членамі Аўтадору ў Мазыры запісаліся: Акрсельсаюз, Камунальны трэст, крэдытнае сельска-гаспадарчае таварыства, таварыства «Смычка», таварыства палуўнічых і інш.

Праца аўта-трактарнай сэкцыі разгортваецца слаба, бо няма аўтачастак і патрэбнай літаратуры.

Па Мазырскай акрузе праведзена самаабкладаньне насельніцтва. Сабрана 246800 р. З гэтай сумы на будаўніцтва дарог пакуль што выдзелена 51.000 руб. Магчыма, што ў далейшым гэта сума будзе павялічана.

С. А.

Нарада прадстаўнікоў аддзяленьняў Дзяржгандлю.

14-га красавіка пачнецца пашыраная нарада прадстаўнікоў Дзяржгандлю Беларусі. Нарада мае падвесьці вынікі паўгадовай працы, высьвятліць ступень выкананьня загатоўчага і экспортнага плянаў. Галоўную ўвагу нарада зьверне на выкананьне плану ў 2-м паўгодзьдзі, асабліва на выяўленьне ўсіх рэсурсаў БССР у загатоўцы другарадных відаў экспорту і прамысловага экспорту.

Вялікая ўвага будзе зьвернута таксама на планавую загатоўку рызьзя.

У Цэнтр. Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР.

Праца дыягнастычнага габінэту.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР была заслухана інфармацыя праф. Ленца аб дзейнасьці дыягнастычнага габінэту па вывучэньні бясспрытульных дзяцей. Гэты габінэт існуе ўсяго 1 з паловай месяцы, але за гэты час правёў значную працу. Апрача абсьледаваньня дзяцей, габінэтам праведзена канфэрэнцыя працаўнікоў дзіцячых дамоў, на якой былі прадэманстраваны вопыты па вывучэньні бясспрытульных дзяцей. Перашкодай у працы зьяўляецца адсутнасьць належнага памяшканьня.

Дзейнасьць Менскага т-ва «Прыхільнік Дзяцей».

Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі заслухаў даклад аб працы Менскага т-ва «Прыхільнік дзяцей». У працы т-ва мецца значнае ажыўленьне і цэлы шэраг дасягненьняў.

Дзеля папярэджваньня прытоку бясспрытульных дзяцей у Менск з райёнаў т-ву запрапанавана ўзмацніць працу на мясцох, асабліва ў мястэчках і вёсках.

Пленум ЦСПСБ.

Учора вечарам у Малой залі клюбу К. Маркса распачаўся чарговы пленум ЦСПСБ.

За прагул будуць плаціць валакітчыкі.

Наркампрацы і Нар. Кам. Юстыцыі распрацавалі праэкт закону аб адміністрацыйна-матар'яльнай і крымінальнай адказнасьці адміністрацыі за няправільныя звальненьні, зацягваньне канфліктаў і за невыкананьне судовых пастаноў па працоўных справах.

Водлуг новага закону, у выпадках, калі будзе ўстаноўлена, што адміністрацыя сьвядома зацягвае выкананьне пастаноў ніжэйшых канфліктных арганізацый, яна будзе прыцягвацца да адказнасьці, а разам з тым з адміністратараў будуць сыскавацца выплачаныя за прагул грошы.

Аб вызваленьні ад гэрбавага збору.

Пастановай Народнага Камісарыяту Фінансаў СССР ад 19 сакавіка 1928 году, за № 398, ад гэрбавога збору вызвалены ўсе паперы па справах самаабкладаньня па закону 24 жніўня 1927 году, якія датычацца асоб, прыцягваемых да самаабкладаньня выключна па акладах с.-г. падатку.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ІНСПЭКТАРОЎ ПАЛІТАСЬВЕТЫ.

Наркамасьветы склікае на 17 красавіка ўсебеларускую нараду акруговых інспэктароў палітасьветы. Нарада распрацуе асноўныя прынцыпы і мэтады складаньня плянаў ліквідацыі няпісьменнасьці, а таксама будуць абгавораны інфармацыйныя даклады з месц аб працы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

БЯСПЛАТНЫЯ ЛЕКЦЫІ ПА ФАТАГРАФІІ.

Праўленьне Менскага т-ва фото-аматараў пастанавіла арганізаваць у Менску бясплатныя лекцыі па фатаграфіі для рабочых, служачых, рабкораў, насьценкораў і г. д.

Перад ЦСПСБ узбуджана хадайніцтва аб апавяшчэньні аб гэтым калектываў рабочых і служачых. Лекцыі будуць чытаць найвыдатнейшыя спэцыялісты-мастакі Беларусі. Лекцыі распачнуцца ў красавіку.

Імпортныя машыны для рэзкі фанэры.

Гэтымі днямі з Нямеччыны атрымана партыя машын для рэзкі фанэры. Машыны будуць разьмеркаваны паміж прадпрыёмствамі «Лесбелу».

ЗАБАРОНА ПАЛЯВАНЬНЯ НА ПТУШАК.

Нар. Кам. Земляробства, на аснове пастановы Савнаркому БССР, забараніў у працягу сёлетняй вясны паляваньне на ўсе віды птушак.

Гэта мерапрыёмства дасьць магчымасьць захаваць некаторыя асабліва каштоўныя віды птушак ад зьнішчэньня.

ПРАЦКАЛЕКТЫЎ ПА ВЫРАБУ ЖОРНАВАЎ.

Закончана арганізацыя і абсталяваньне новага працкалектыву па вырабу мынавых жорнаваў. У гэтым працкалектыве будзе занята 30—40 рабочых.

Абсталяваньне працкалектыву каштавала 15.000 руб.

РУХ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў МЕНСКУ.

У працягу сакавіка ў Менску нарадзілася 324 чал., памёрла—174 чал.

За гэты-ж самы час адбылося 115 шлюбаў і 62 разводы.

БІБЛІАГРАФІЯ.

„Советское строительство" № 2, февраль 1928. Изд. Госплана БССР.

«Скажы, хто твае сябры, і я скажу, хто ты». Гэтае прысловоўе можна абярнуць так: «Скажы, што чытаеш, і я скажу, хто ты». Такое пытаньне я задаю гаспадарнікам і савецкім будаўнікам БССР? Ці пацікавіліся вы, даражэнькія, адзінай эканамічнай часопісьсю на Беларусі, ці чытаеце вы яе, што вы самі дадаеце для разьвіцьця эканамічнай думкі, для пастаноўкі і вырашэньня стоячых перад намі праблем эканамічнага і культурнага будаўніцтва. Усе гэтыя пытаньні цікавяць таму, што рэцэнзіруемая часопісь з тыражу ў 500 экземпляраў мае ня звыш сотні дапішчыкаў. А ў той-жа час у нас тысячы людзей сядзець на адказных гаспадарчых пастох, сотні адказных камуністых кіруюць эканамічным і культурным будаўніцтвам. Над усім гэтым трэба задумацца. У чым прычына? Можа часопісь сама па сабе ня цікава? Дык, вось, нумар другі часопісі запоўнен артыкуламі на самыя, як кажуць, «жывотрепещущие» тэмы беларускай рэчаіснасьці. Тут і пытаньні арганізацыі і рацыяналізацыі вытворчасьці і гаспадаркі (артыкулы А. Хацкевіча, М. Масткова і М. Шпунта) і цікавейшы арт. інж. Эпштэйна аб вырабу штучнага валакна; ня лепш цікавая манаграфія П. А. Тарасава аб рыбнай гаспадарцы Беларусі; каштоўны артыкул М. Кардашэнкі „Да пытаньня налогавай палітыкі ў вёсцы", стацьці аб транспарце, аб культурным будаўніцтве. Усе гэтыя артыкулы закранаюць тую ці іншую праблему нашай эканомікі, нашай культуры. Але хто іх чытае? Калі мала чытаюць, дык чаму? Асноваўная прычына памаймі—нявысокі культурны ўзровень у значнай часткі нашых гаспадарнікаў, адсутнасьць жывое эканамічнае думкі, а разам з гэтым трафарэтнае, мэханічнае выкананьне тых абавязкаў, якія на іх узложаны.

Вось якія думкі-мысьлі навеяў на мяне перагляд журналу „Советское строительство". Журнал трэба выдаваць у меншым разьмеры, зьнізіўшы і цану. У журнале адсутнічае сталая хроніка замежнай эканомікі. Вельмі пажадана ўвесьці пэрыядычны агляд эканомікі нашых суседаў—Польшчы, Літвы, Латвіі.

З 23 артыкулаў і рэцэнзій толькі тры зьмешчаны на беларускай мове, і то мабыць, забудзіліся ды папалі неўзнарок. Для чаго-ж тады беларская шыльда на абложцы «Савецкае будаўніцтва»? Можа рэдакцыя адкажа. Праўда, рэдакцыя можа аргумантаваць тым, што беларуская мова можа перашкаджаць пашырэньню часопісі. Вопыт трохгадовага выданьня на расейскай мове з «убийственным» тыражом гаварыць, што ня тут прычына.

А пара паклапаціцца аб беларусізацыі беларускай часопісі „Советское строительство".

А. СЯНКЕВІЧ.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кніжкі:

1. «Макарка» С. Сямёнава. Стар. 23, цана 12 кап.
2. «Грамадазнаўства» Я. Рубіна, Л. Голмштака, Г. Аляксандрава і Ю. Дардака. Рабочая кніжка для У году навучаньня, частка першая. Стар. 104, цана 1 руб. (на яўрэйскай мове) Бел. Дзяржаўнага Выдавецтва.
3. „Революция и Культура" № 6. Стар. 80, цана 50 кап.
4. «Большевик» № 6 за 1928 г. Стар. 96, цана 40 кап. Выданьне газэты «Правда», Масква.

СУД.

КАНТРАБАНДЫСТЫ.

У студзені 1925 г. грамадз. г. Менску Шэйна Абрамава Гурвіч варочалася з Масквы ў г. Менск хуткім цягніком. Гурвіч ехала ў спальным купэ, але холад перашкаджаў спаць, і яна ад Смаленску да Менску ехала ў вагоне-рэстаране: піла чаёк; абедала, вячэрала і нават частавала віном служачых рэстарану Хведара Драздова і іншых.

Шэйна Гурвіч—баба ня дура: пазнаёміўшыся з поварам кухні Дзянісавым і афіцыянтамі Капэрнікам і Драздовым, яна запрасіла іх да сябе на кватэру—«гульнуць». „Масквічы" згадзіліся. Увечары ў доме Гурвіч адбылася багатая вячэра з выпіўкай.

Калі хмель разабраў гасьцей, Гурвіч пусьцілася на адкравеннасьць і запрапанавала гасьцям добры ганарар за правоз у Маскву кантрабанды ў кухні вагону-рэстарану.

«Масквічы» згадзіліся.

Раніцой к часу адходу цягніка Гурвіч нагрузіла Дзянісава, Капэрніка і Драздова кантрабандай, якую апошнія схавалі ў спэцыяльна прыстасаваных кантрэсах пад верхняй вопраткай і накіраваліся на станцыю. Але ня спалі супрацоўнікі Менскай мытніцы. Яны заўважылі, што «масквічы» за адну ноч так растаўсьцелі, што на іх аж польты разьдзіраюцца. Прасачыўшы далей і прымеціўшы, што кантрабанда ўехала ў кухню вагону-рэстарану, мытнікі зрабілі вобыск, у часе якога знайшлі коцікавыя скуркі, нітки, гузікі шалі і інш., на агульную суму 2717 р. Дзянісаў, Капэрнік і Драздоў былі затрыманы і прыцягнуты да адказнасьці, а Гурвіч схавалася, і яе не знайшлі да гэтага часу.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Германа Дзянісава, Васіля Капэрніка і Хведара Драздова на год зьняволеньня кожнага. Дастасаваўшы амністыю ў адзнаку 10 гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі, суд ад трыманьня асуджаных над вартай вызваліў. Кантрабанда канфіскавана ў даход дзяржавы.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

За кражу фатаграфічных апаратаў.

Грамадз. г. Менску Міхась Няфедаў і Пётра Шчасны ў ноч на 25 кастрычніка 1927 году праз палом вакна ў памяшканьні працкалектыву фатографаў укралі два фатаграфічныя апараты і бялізну гр. Мікалая Мядзёлка.

Менскі акруговы суд прыгаварыў—Міхася Няфедава і Пётру Шчаснага на тры гады зьняволеньня кожнага, але на аснове амністыі скараціў пакараньне на адну трэць.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 10 КРАСАВІКА).

Абл. 1-й дзярж. паз.—прад. 4-61, куп.—4-59; абл. 2-й дзярж. паз.—прад. 4-96, куп.—4-94; абл. 2-й сял. паз. прад.—5; абл. 3-й сял. паз.—прад. 5-02,5, куп.—5-00,5; абл. 10 проц. дзярж. паз.—прад. 25-13, куп. 25-03; абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 119-50, куп. 117-50; абл. 12 проц. дзярж. паз.—прад. 104-35, куп. 104-30; абл. 5 проц. паз. індустр.—прад. 24-32,5, куп. 24-22,5.

Папраўка.

У № 84 нашай газэты (за 8 красавіка г. г.) у аддзеле «Трамвай ці аўтобус» укралася памылка. Надрукавана: «Гутарка з інжынэрам Дзяржпляну БССР тав. Крывіцкім», а трэба—«...з тав. Макрыцкім».

Апавяшчэньне.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, 10 красавіка—пастаноўка к-ву Расейскай Драмы—„9-я жонка Чуліна". Пачатак а 8 г. увеч. Білеты пры ўваходзе.

ТЭАТР-КІНО.

ЯЎРЭЙСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Чацьвер 12 красавіка „ОВЕЧИЙ ИСТОЧНИК" у 3-х актах.
Білеты ў касе тэатру.

Пятніца 13 і субота 14 красавіка „ГИРШ ЛЕКЕРТ"
Драматычная паэма ў 3-х акт. 10 карц.
Білеты на 13—у саюзе савгандльслуж., на 14 усе білеты прададзены.
Пачатак спэктакляў у 8 з пол. гадз. веч.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". 3 аўторка, 9-га красавіка, выдатны нямецкі артыст КОНРАД ВЭЙДТ у новай выключнай нямецкай пастаноўцы „ЦІ СЬМЕЕМ МЫ МАЎЧАЦЬ". Трагэдыя ў 7-х частках. Пачатак 1-га сэансу ў 7 гадз. веч. ТОЛЬКІ 3 СЭАНСЫ!

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». З карціны за адзін сэанс! І. Савецкі бытавы фільм „ДОМ В СУГРОБАХ" у 6 частках. II і III. Дзьве амэрыканскія трукавыя камэдыі: „НАХОДЧИВЫЙ ПОКЛОННИК" у 2 частк. і „ДЖЕК, СЛОН И К-о". Пачатак сэансаў у 6 з пал. гадз. веч.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". 2 фільмы за адзін сэанс. 2 I. „ДОЧЬ ДЖУНГЛЕЙ" драма ў 6 частках. II. „ПОБЕГ" драма ў 6 частках.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». ЯШЧЭ 6 ДЗЁН грандыёзны гістарычна-рэвалюцыйны баявік „КАСТРЫЧНІК".

Пастанова.

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

ПРА ЛІКВІДАЦЫЮ МІЖВЕДАМСТВЕННАЙ МЭТРЫЧНАЙ КАМІСІІ І ПЕРЕДАЧУ ЯЕ ФУНКЦЫЙ ВЫШЭЙШАМУ САВЕТУ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР.

Бяручы пад увагу тое, што 1) правядзеньне мэтрычнай рэформы ў БССР амаль поўнасьцю скончана ў гандлі, прамысловасьці, сельскай гаспадарцы, а таксама і ў сацыяльна-культурнай галіне, 2) што далейшая работа па правядзеньні мэтрычнай рэформы павінна весьціся агульнасаюзнымі органамі (стандартызацыя разьмераў жалеза, лесу і інш.,) і ў БССР яна выявіцца амаль выключна ў нагляде за ажыцьцяўленьнем пастаноў М. М. К. пры Эканамічнай Нарадзе і Цэнтральнай М. М. К. пры Савеце Працы і Абароны, а таксама ўкараненьні мэтрычных мерак у ўжытку сельскага насельніцтва—Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Міжведамственную Мэтрычную Камісію пры Эканамічнай Нарадзе ліквідаваць; усе яе функцыі па далейшым правядзеньні мэтрычнай рэформы, а таксама і архіву яе перадаць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

2. Запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі БССР усю работу па канчатковым ажыцьцяўленьні мэтрычнай рэформы весьці праз Праверачную Палату Мерак і Ваг, а праэкты пастаноў і інструкцый уносіць на зацьверджаньне Эканамічнай Нарады.

3. Абавязаць народныя камісарыяты і акруговыя выканаўчыя камітэты дапамагаць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі ў справе ажыцьцяўленьня мэтрычнай рэформы.

4. Даручыць Цэнтральнай Статыстычнай Управе і Народнаму Камісарыяту Фінансаў распрацаваць і ўнесьці ў Эканамічную Нараду пытаньне аб магчымасьці вядзеньня ўсіх статыстычных работ, а таксама пераводу аб'ектаў абкладаньня па сельска-гаспадарчым падатку на мэтрычныя меркі ў тэрміны, устаноўленыя Міжведамственнай Мэтрычнай Камісіяй да 1-га студзеня 1929 году.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР В. Крывіцкі.

2-IV—28 г.

Постановление

Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР

**О ЛИКВИД